Пролетарыі всіх краін, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 473. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад яўтарам не вярочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ 2 р. 70 к. „ 6 „ 4 р. — к. „ 1 год 8 р. — к. Замест кароткі: Ізмагародзіна — 90 к. Масковы — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок пашпаравай шасьця тэксту — р. 50 к. За радок пашпаравай пасярод тэксту 1 р. — к. Ва радок пашпаравай перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьвяшчэнныя ня 50 проц. дарожэй. Зваш чарнёў бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 радок . . . 35 пас. За кожны далучаны . . . 15 „ Беспрацоўн. і чырвонармейцы за дакумэнт . . 15 „ За кожны дадатковы . . 5 „ Публікацыя ЗАГСу—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ў ўсіх пошт.-тэл. пунктах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 215 (2704) Пятніца, 20-га верасьня 1929 г.

ТРЭБА ЎЗМАЦНІЦЬ ТЭМП ХЛЕБАЗАГАТОВАК

Дырэктывы партыі і ўраду аб скарачэньні тэрміну паміж зборам і абмолатам новага ўраджаю сёлета трэба ажыцьвіць больш менш выкананымі. Гэта залежыць за тое, што ўжо цяпер у распорядзе ня значныя запасы абмалочанага лішкаў хлеба; сьцьвярджаецца шмат і ажыўленьнем хлебнага рынку.

Таксама ажыўленьню хлебнага рынку значна дапамагло і тое, што сёлета ў нас маем павялічэньне ўраджаю, бо маем і тое, што ў выніку пашырэньня пасеўнай плошчы значна палепшыўся і валавы збор ураджаю.

Усё гэта ўтварае больш спрыяючыя абставіны для разгортваньня хлебазагатоўчай кампаніі, чым мы мелі ў мінулыя гады. Калі-ж да гэтага яшчэ дадаць і тое, што значная колькасьць хлеба павінна паступіць на выкананьні і ад калгасаў і савгасаў, куды якіх у сёлетняй загатоўчай кампаніі ўрасла, дык можна з упэўненасьцю сказаць, што сёлета мы ня будзем мець такога напружанага стаўленьня з хлебазагатоўкамі, як у мінулыя гады.

Але захапляцца гэтым ні ў якім разе нельга, бо мы наглядаем другія ненармальныя бакі ў справе разгортваньня сёлетніх загатовак. Трэба мець на ўвазе, што гэтую загатоўчую кампанію нельга расьцягваць на цэлы год. Яна павінна быць праведзена ў працягу бліжэйшых месяцаў, у працягу паўгода.

Як востра адмоўныя зьявішчы мы назіраем тое, што цяпер узмацнілі сваю дзейнасьць розныя спэкулянты, скупшчыкі, перакупшчыкі, яны, здаецца, раней нашых арганізацый закупляюць хлеб.

А таксама кулакі асабліва ў гэтым годзе адкрылі паход супроць нашае хлебазагатоўчае кампаніі. Усё гэта накладае на ўсе мясцовыя арганізацыі і асабліва на загатоўчыя абавязак вылучэньня большае ўвагі загатоўчай рабоце.

Усё гэта патрабуе таго, каб нашыя арганізацыі дабіліся пералому ў гэтай справе.

А такога пералому яшчэ няма. Хлебазагатоўкі ў большасьці ідуць яшчэ самацёкам. Мясцовыя загатавіцелі, якія пабачылі, што плян жнівеньскіх загатовак выкананы, пачынаюць ужо адпачываць, пачынаюць «пачывать на лаврах». А між тым справы абстаяць зусім ня так, як яны здаюцца некаторым загатавіцелям. Праўда, плян жнівеньскіх хлебазагатовак выкананы на 112,7 проц. Гэта калі лічыць агулам. А калі-ж прыглядзецца да тых лічбаў, якія паказваюць пра загатоўку хлеба ў сялян непасрэдна самімі загатавіцелямі, дык справа пакажацца значна горшай. Ад сялянства загатоўлена толькі 48,4 проц. пляну. І з гэтага ліку значная колькасьць паступіла самацёкам. Загатоўчымі арганізацыямі непасрэдна яшчэ мала зроблена да разгортваньня загатовак. Загатоўлены за жнівень хлеб у большай сваёй частцы паступіў у выніку агульнай агітацыі, паступіў ад чырвоных бядняцка-серадняцкіх абозаў.

Такім чынам „на лаврах начывать" некалі і нельга. Тым больш што плян верасьнёўскіх загатовак зьяўляецца самым большым плянам і самым ударным і важным пунктам ува ўсіх загатоўках.

На мясцох яшчэ ня ўсё зроблена да ахапленьня ўсіх тых загатовак, якія павінны быць зроблены ў верасьні месяцы. Пераваліла ўжо за палову месяца, а значнага зруху яшчэ ня відаць, яшчэ шмат дзе да гэтай важнай справы загатавіцелі адносяцца бюракратычна, немажліва паціхоньку, памаленьку. У некаторых мясцох ня прыняты нават меры да забесьпячэньня памяшканьнем і тараю новапаступаючага хлеба. Так, у Мазыршчыне не хапае складавых памяшканьняў, у Магілеўшчыне невыстарчае тары.

А барацьба за хлеб між тым разгортваецца. Беднота разам з сераднякамі актыўна выступае супроць кулацтва, якое жадае сарваць нашыя пляны. Мы маем шмат прыкладаў, калі беднота робіць папраўкі ў плянах нашых загатавіцельных арганізацый і паказвае магчымасьць зусім лёгка загатовіць большую колькасьць, чым было намечана спачатку. Беднота выкрывае ўсе кулацкія махінацыі. Беднота дапамагае нашым загатоўчым арганізацыям.

Гэты рух трэба скарыстаць, гэтую кампанію трэба правесьці пад лёзунгам саюзу бедняка і серадняка супроць кулацтва. Клясавая лінія ў загатоўках павінна быць у цэнтры ўвагі.

Толькі пры падтрымцы бядняцтва на вёсцы, пры мабілізацыі да гэтай справы ўсіх арганізацый, пры ўзмацненьні тэмпу мы правядзем загатоўкі ў тэрмін і поўнасьцю.

У лягеры кітайскай контр-рэвалюцыі.

ЗАНЕПАКОЕНЫ, „ПЕРАСОЎКАЙ ВОЙСКА".

ПЭЙПІН, 18-9. Кітайскі друк у Пэйпіне ўстрывожан паведамленьнем аб „дзіўных перасоўках" японскай падмогі з Чаньчуну ў Мукдэн. Адначасова японскае агенцтва Ніпон паведамляе, што батальён японскага палка, які праводзіць навучаньне ў прадмесьцях Мукдэну, быў абстраляны з нейкай кітайскай установы. Японскія вайсковыя ўлады арыштавалі кіраўніка гэтай установы і патрабуюць, каб ён быў пакараны сьмерцю.

УЦЯКАЮЦЬ З ПАГРАНІЧНАЙ.

ТОКІЁ, 18-9. Згодна афіцыйных сводак, апублікаваных у Мукдэне, 13 верасьня 600 кітайцаў жыхароў Пагранічнай пакінулі гэтую станцыю і прыбылі ў Харбін. З тым-жа цягнікам былі дастаўлены ў Харбін 145 савецкіх чыгуначнікаў.

Згадна тых жа крыніц, група невядомых спрабавала 14 верасьня запаліць мост праз раку Сунгары. У выніку перастрэлкі быў забіты кітайскі афіцэр і адзін кітайскі салдат паранены. Тыя, што замахваліся, уцяклі. Мост застаўся непашкоджаным.

ЛЯГЕРЫ ПЕРАПОЎНЕНЫ.

ТОКІЁ, 18-9. Нямецкі генэральны консул у Манчжурыі Штобэ ў інтэрв'ю, дадзеным харбінскай газэце „Русское Слово" заявіў: „У Сумбэйскім лягеры вялікая заграмаджанасьць. У камэры, дзе можна разьмясьціць 60 чалавек, знаходзіцца па 80. Ніжэйшы персанал канцэнтрацыйнага лягеру часам груба абыходзіцца са зьняволенымі».

ЯПОНІЯ ПРАТЭСТУЕ.

ШАНХАЙ, 18-9. Японскі консул у Нанкіне заявіў пратэст супроць прасьледваньня ў Нанкіне 3-х шанхайскіх газэт на японскай мове. Нанкінская пошта ня прымае гэтых газэт да перасылкі.

ПАТРАБУЮЦЬ ВЫСТУПІЦЬ АДКРЫТА.

ЖЭНЕВА, 15-IX. Як заўсёды, у часе пленумаў Лігі Нацый, усялякія антыбальшавіцкія і белагвардзейскія арганізацыі праз услужлівы швайцарскі друк, а таксама шляхам распаўсюджаньня сярод дэлегацый пленуму розных „мэмарандумаў", „праэктаў", лістовак і т. д., разьвіваю тут у сучасны момант узмацнёную антысавецкую дзейнасьць і заклікае „да больш актыўнай" барацьбы з СССР і сусьветным камунізмам.

„Журналь дэ Жэнэў" публікуе адозву „Лігі Обэра" („міжнародная антанта барацьбы супроць 3-га інтэрнацыяналу"), падпісаную „старшынёй сталага бюро" лігі Обэрам. Для адозвы характэрны ня столькі звычайная гісторычная антысавецкая траўля і хлусьня, на якую наўрад ці зьвярнуць сур'ёзную ўвагу прадстаўнікі самых рэакцыйных урадаў, колькі канкрэтная спроба Обэра выкарыстаць для антысавецкай прапаганды французскія ідэі пан-Эўропы, якія ён небеспадстаўна лічыць вусім годнымі для спробаў утварэньня антысавецкага блёку.

Наракаючы на невыстарчальнасьць міжнародных мерапрыёмстваў супроць бальшавізму, адозва заканчваецца наступным зваротам да Лігі Нацый: „Эўропа ня можа разьлічваць на выхад з свайго цяжкага становішча, пакуль існуе СССР, пакуль урады на здолелі прымірыць уваемныя ахвярам свае спрэчкі з тым, каб дамовіцца аб абароне агульных інтарэсаў ад бальшавізму. У сучасны пэрыяд, калі пастаўленыя ў Гаазе праблемы вырашаны, мы патрабуем ад Лігі Нацый ужыць рашучую і адкрытую барацьбу з бальшавізмам у міжнародным масштабе".

Заява савецка-ангельскай гандлёвай палаты.

МАСКВА. Усесаюзна-Заходняя гандлёвая палата атрымала паведамленьне ад руска-брытанскай гандлёвай палаты ў Лёндане аб тым, што ў сувязі з рашэньнем брытанскага ўраду распаўсюдзіць льготы сыстэмы дзярж. крэдытнага гарантый у адносінах да брытанскага экспартнага гандлю з СССР, руска-брытанская гандлёвая палата склала спэцыяльны мэмарандум, у гэтым мэмарандуме даецца працэдура, якую павінны прарабіць брытанскія экспартныя фірмы дзеля атрыманьня паказаных вышэй крэдытаў.

Брытанскія экспарты, якія атрымалі заказы ад саюзных устаноў, або трэстаў могуць зьвярнуцца з адпаведнымі заяўкамі ў аддзел экспартных крэдытаў міністэрства гандлю. Па прапанове руска-брытанскай гандлёвай палаты, брытанскія экспартныя крэдыты па канкрэтных заказах будуць прадстаўляцца на тэрміны ня звыш 6 месяцаў.

АД АБАРОНЫ—ДА НАСТУПУ.

Кампартыя начале рэвалюцыйнага ўздыму.

МАСАВЫЯ ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗАБАСТОЎКІ. РАБОЧЫЯ ІМКУЦЦА УЗБРОІЦЦА

ВЕНА, 17-9. Палітбюро аўстрыйскай-кампартыі вынесла рэзалюцыю па пытаньні аб палітычным становішчы ў Аўстрыі. Рэзалюцыя падкрэсьлівае, што падзеі ў Сэнт-Лёрэнцы зьявіліся пачаткам рашучага этапу клясавай барацьбы ў Аўстрыі.

Ня гледзячы на нязначныя разнагалосьсі, уся буржуазея дамагаецца агалошаньня фашысцкай дыктатуры шляхам адначасовага выкарыстаньня сродкаў урадавага фашызму і тэрору хэймвэрскага фашызму. Сацыял-дэмакратыя, якая засьцерагае ад паўстаньня хэймвэраў супроць ураду, робіць грубы злачынны абман, які мае на мэце адцягнуць увагу рабочых ад сапраўднай небясьпекі.

У Аўстрыі з поўнай яснасьцю пацьвердзілася правільнасьць рэзалюцыі 6 кангрэсу Камінтэрну і 10 пленуму Выканаўчага Камітэту Камуністычнага Інтэрнацыяналу аб крызісе і фашызацыі буржуазнай дэмакратыі цалком. Усе буржуазныя партыі стаяць за перагляд канстытуцыі. Сацыял-дэмакраты гатовы пайсьці на шырокія ўступкі фашысцкай праграме. Аднак, рабочая кляса не дапусьціць зьмены канстытуцыі ў фашысцкім духу. Адначасова з падрыхтоўкай да фашысцкага перавароту пачалося новае наступленьне прадпрыёмцаў на рабочых. Таксама надзвычайна ўзрастае дарагоўля. Але побач з ростам фашысцкага наступу мае месца значнае палявеньне рабочае клясы, яскравым доказам чаго зьяўляецца напружанасьць і вострасьць барацьбы, стыхійныя забастоўкі і імкненьне рабочых узброіцца.

У шэрагах дробнага сялянства расьце нездавальненьне. Дробны селянін пакутуе ад сельска-гаспадарчага крызісу і ад марнатраўства буйных абшарнікаў і фінансавага капіталу. Тут можна было „пробить брешь" у фашысцкім фронце. Выкрываючы далей ролю сацыял-дэмакратыі, якая ўсё больш і больш коціцца на шлях сацыял-фашызму, рэзалюцыя падкрэсьлівае, што неабходны абавязкова практычна вырашыць пытаньне аб узброеньні рабочых.

У заключэньне рэзалюцыя заклікае партыю стаць на чале рэвалюцыйнага ўздыму рабочае клясы і даць яму арганізацыйныя формы і кіраўніцтва.

На зьезьдзе унітарнай канфэдэрацыі працы.

КЛЯСАВЫЯ БАІ ПРАЛЕТАРЫЯТУ ПРЫЙМАЮЦЬ ХАРАКТАР НАСТУПУ.

ПАРЫЖ, 18-9. На зьезьдзе унітарнай канфэдэрацыі працы выступіў з вялікай прамоваю прадстаўнік Выканбюро Прафінтэрну. „У недрах самой унітарнай канфэдэрацыі працы,—сказаў ён,—неабходна перамагчы плынь, якая спрабуе адхіліцца ад рэвалюцыйнай лініі і пакаціцца ў балота рэфармізму. Далей прамоўца падкрэсьліў, што барацьба супроць СССР ужо выйшла са стадыі падрыхтоўкі да вайны і прыймае формы нападу, як гэта мае месца на Далёкім Усходзе.

Спробы міжнароднай буржуазеі ўзмацніць капіталістычную сыстэму пры дапамозе звыш эксплёатацыі пралетарыяту ўзмацняюць эканамічныя супярэчнасьці паміж краінамі, таксама і клясавыя баі, якія ўсё больш і больш трацяць абаронны характар, ператвараючыся ў контр-наступ пралетарыяту. Побач з палявеньнем мас мы наглядаем зьмены ролі рэфармістаў: калі ў папярэдні пэрыяд яны былі як апартуністычная плынь, дык цяпер яны ператварыліся ў сапраўдных штрэйкбрэхэраў. Цяперашняя меншасьць унітарнай канфэдэрацыі прадстаўляе сабой нішто іншае, як спадчыну старых традыцый анарха-сынды-калізму. У той час, калі большасьць канфэдэрацыі вядзе сапраўдную рэвалюцыйную лінію, групы, якія далучаюцца да „сынды-калісцкай лігі", зьяўляюцца ўдзельнікамі адзінага фронту з рэфармісцкімі лідэрамі, пазіцыя якіх ёсьць пазіцыя капітуляцыі.

Зьезд прызнае шчыльную сувязь паміж барацьбой эканамічнай і палітычнай, і палітычнае кіраваньне камуністычнай партыяй у эканамічных бойках, але, тым ня менш, дапусьціць прадстаўніцтва меншасьці да ўдзелу ў кіраўніцтве ўнітарнай канфэдэрацыі, калі толькі меншасьць згодзіцца на лаяльнае супрацоўніцтва.

З вялікай прывітальнай прамовай выступае прадстаўнік рэвалюцыйнага крыла нямецкіх прафсаюзаў.

Ад імя унітарнай канфэдэрацыі Жытон вітае прадстаўніка Прафінтэрну і прадстаўніка нямецкіх рэвалюцыйных прафсаюзаў.

На зьезд прыбыла дэлегацыя бастуючых рабочых электрычнай кампаніі. Бастуючыя вітаюць зьезд і абяцаюць далучыцца да унітарнай канфэдэрацыі. Зьезд прыймае рэзалюцыю наконт катастрофы Ці-Расель.

САРВАЦЬ ЗАБАСТОЎКУ НЕ ЎДАЛОСЯ.

БЭРЛІН, 17-9. Не гледзячы на высілкі рэфармісцкага кіраўніцтва сарваць забастоўку трубапракладчыкаў з дапамогаю штрэйкбрэхэрства, баявы фронт бастуючых застаецца непарушным. З другога боку прадпрыёмцы патроху ідуць на ўступкі: 60 фірмаў здаволілі ўсе вымаганьні бастуючых. З дазволу стачачнага камітэту праца трубапракладчыкаў у гэтых фірмах аднавілася.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ЗЬЕЗДУ.

БЭРЛІН, 17-IX. На 30-е лістапада склікаецца зьезд рэвалюцыйнага крыла нямецкага прафруху, на якім будуць прадстаўлены ўсе левыя прафсаюзныя арганізацыі, левыя фабкомы і камітэты беспрацоўных.

ДЭМАНСТРАЦЫЯ КАМСАМОЛУ.

ВЕНА, 19-IX. Ня гледзячы на забарону дэманстрацый у Вене, 18-га верасьня ў рабочых райёнах камсамол наладзіў шэраг анты-фашысцкіх сходаў. Па сканчэньні сходаў адбылася дэманстрацыя. Некалькі рабочых і камсамольцаў арыштаваны.

Забіта 19.

ПАРЫ�Ж, 17-9. У часе ратавальных работ у каменна-вугольнай капальні „Піросэль" сёньня было выяўлена яшчэ 4 трупы рабочых. Такім чынам, агульная колькасьць забітых у часе выбуху складае 19 чалавек.

СПАБОРНІЦТВА НЯМЕЦКІХ КАМУНІСТАЎ.

ВЕНА, 17-IX. Венская „Ротэ Фанэ" друкуе прапановы, якія паступілі ад райённых арганізацый кампартыі, аб наладжаньні спаборніцтва паміж імі. Спаборніцтва намячаецца на тэрмін 4—6 тыдняў і павінна заключацца: у павялічэньні ліку ячэек ня менш, чымся на 60 проц., у павялічэньні ўдвое ліку фабрычна-заводзкіх газэт, у вярбоўцы рабкораў для „Ротэ Фанэ" і г. д.

ФАШЫСТЫ ЗАБІЛІ РАБОТНІЦУ.

НЬЮ-ЁРК, 14-IX. Спрабуючы сарваць мітынг бастуючых тэкстыльшчыкаў у Гастоніі, натоўп фашыстаў напаў на грузавік, які адвозіў рабочых да месца мітынгу, і распачаў па рабочых страляніну, прычым забіў работніцу Эллу Вігінс, матку 4-х дзяцей, сэкратаршу саюзу тэкстыльшчыкаў у Бэсемэр-Сіці. Арыштавана некалькі чалавек па абвінавачаньні ў забойстве „бяз злога намеру", хоць Элла Вігінс была забіта ў часе адкрытага нападу на грузавік з рабочымі. Сьведкі заяўляюць, што служачыя тэкстыльных прадпрыёмстваў далі загад навочдыкам пачаць агонь.

* * *

НЬЮ-ЁРК. Ня гледзячы на вялікі дождж, некалькі сот тэкстыльшчыкаў у працягу некалькіх гадзін прасталі перад домам Бэллы Вігінс, забітай фашысцкімі налётчыкамі ў мінулую суботу ў часе нападу, зробленага на грузавік, на якім бастуючыя тэкстыльшчыкі Гастоніі накіроўваліся на мітынг. Тэкстыльшчыцы, якія сабраліся да дому Бэллы Вігінс, у поўным складзе прапушчалі яе да могілак. Пасьля Бэллы Вігінс засталося 4 дзяцей. У многіх гарадох Злучаных Штатаў склікаюцца мітынгі пратэсту супроць фашысцкага тэрору ў паўдневых штатах.

ФАШЫСТЫ РЫХТУЮЦЦА.

ВЕНА, 18-IX. Сацыял-дэмакраты на нарадзе бюджэтнай камісіі парляманту вялі перамовы з урадавымі партыямі з поваду пагроз хэймэвараў зьмяніць канстытуцыю. Лідэр сацыял-дэмакратаў Юліус Дэйч, зазначыўшы на пагрозу, выказаную ўрадавай „Рэйхпост" перанесьці парлямант з Вены ў іншы горад, у выпадку немагчымасьці правядзеньня ў атмасфэры Вены перагляду канстытуцыі, заявіў: „сацыял-дэмакраты не баяцца будучыні. Дзе-б ня быў скліканы парлямант, знойдзецца даволі дэмакратычных элемэнтаў, якія выступяць за канстытуцыю. Сацыял-дэмакраты гатовы да перагавораў у парляманце. Аднак, партыя будзе супроцьзейнічаць усякім спробам гвалтоўных зьмен канстытуцыі, будучы ўпэўнена ў падтрыманьні ўсіх рэспубліканцаў".

Пад дружны гоман.

БЭЛЬФАСТ, 18-9. Апошнія пасяджэньні вьезду ангельскіх прафсаюзаў прайшлі пры амаль поўным адсутнічаньні інтарэсу да абгаварываемых пытаньняў з боку большасьці дэлегатаў. Дэлегаты ў большай частцы вялі прыватныя гутаркі адзін з другімі ў гаме гэтых гутарак прамоўцаў часам зусім ня было чутна.

Кожны раз, калі выяўлялася, што на абгаварэньне ставіцца новая рэзалюцыя, дэлегаты крычалі «прыняць», нават не дачуўшы да канца тэксту рэзалюцыі.

АЧЫСЬЦІМ ШЭРАГІ АД АПАРТУНІЗМУ.

МАСКВА. Пленум ЦК італьянскай кампартыі, які адбыўся ў пачатку верасьня, заявіў аб сваёй поўнай згодзе з рэзалюцыямі 10-га пленуму Выканаўчага Камітэту Камуністычнага Інтэрнацыяналу. ЦК таксама абгаварваў пазіцыю, занятую т. Сэррам. На аснове рашэньня 10-га пленуму Выканаўчага Камітэту Камуністычнага Інтэрнацыяналу Сэрра было запрапанавана ўзяць назад сваю палітычную пляцформу, закляймёўшы пункт гледжаньня правых, адмовіцца ад усякай салідарнасьці з групамі правых і прымірэнцаў і безагаворачна прыняць палітычную лінію і падпарадкавацца дысцыпліне Камінтэрну і італьянскай кампартыі. Сэрра адхіліў гэтыя ўмовы і выступіў з шэрагам поглядаў, якія азначаюць поўны і радыкальны разрыў з ідэалёгіяй, праграмай і палітычнай лініяй сусьветнага камуністычнага руху. З прычыны гэтага, ЦК пастанавіў выключыць Сэрра з шэрагаў партыі і зьвярнуўся да кіруючых органаў Камуністычнага Інтэрнацыяналу з просьбай зацьвердзіць гэту меру.

У панскай Польшчы.

ПРАЦЭС 36 БЕЛАРУСКІХ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН.

ВІЛЬНЯ, 17-IX. Выездная сэсія Віленскага акруговага суду ў Лідзе разглядала справу 36 рабочых і бяднейшых сялян, якіх польская дэфэнзыва пасадзіла на лаву падсудных, як падазроных у прыналежнасьці да камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. У гэтай справе абвінавачваюцца рабочыя Ліды і сяляне суседніх вёсак Жалудкі, Шчочыны і іншых.

Каб зрабіць больш эфэкт «нагнаць страху», паліцыя перад тым, як весьці на суд, пачала каваць рукі і ногі арыштаваным. Палітвязьні запратэставалі. Тады прыбыў новы атрад паліцыі «на дапамогу», які, зьбіваючы палітвязьняў, закаваў рукі і ногі і пад узмоцненай вартай палітвязьняў даставілі ў „дэмакратычны" суд у поўнай форме.

Каля турмы сабраўся вялікі натоўп рабочых і сялян, якія бурна пратэставалі супроць здзекаў над палітвязьнямі. Конная і пешая паліцыя разагнала натоўп і «навяла парадак».

Па гэтай справе суд вынесе вельмі суровы

ПРЫГАВОР:

М. Рабінштэйна, С. Шмуйловіч, Х. Кур, Л. Розэнштэйн, В. Казароўскага па 6 год катаргі кожнага. 8 падсудных на 5 год, 4 падсудных на 4 гады, 12 падсудных ад 3-х да 2-х год катаргі.

6 падсудных суд прызнаў нявінаватымі.

Забаставалі ўсе шаўцы Варшавы.

ВАРШАВА, 16-9. Газэта „Роботнік" паведамляе, што ў Варшаве выбухнула забастоўка шаўцоў. Забастоўка вельмі хутка пашырылася і ахапіла ўсе майстэрні Варшавы. Характэрна дзеля забастоўкі выключнае аднадушша, цьвёрдасьць і ўпэўненасьць бастуючых.

Рабочыя выставілі патрабаваньні аб падвышэньні заробнай платы ад 18 да 25 проц. (у залежнасьці ад катэгорыі) на пару зробленага абутку. Кіруе забастоўкай выбраны рабочымі забастовачны камітэт.

Фашысцкі ўрад ужо два месяцы таму назад выканаў волю гаспадароў майстэрняў і разагнаў прафсаюз шаўцоў, апячатаваў памяшканьне і г. д. спадзяючыся, што гэтым разьбіце рабочых, паралізуе іх волю да барацьбы. Выбухнуўшая з такой выключнай сілай і салідарнасьцю забастоўка лішні раз пацьвярджае, што ніякія прасьледваньні ня здолеюць стрымаць рабочую клясу, якая паўстае на барацьбу.

Паліцыя—„гаспадар" фабрыкі.

ВАРШАВА, 16-9. На фабрыцы „Гном" рабочыя падлягалі ўсялякім прасьледваньням з боку адміністрацыі. Калі рабочы пратэставаў супроць беспадстаўнага штрафу, ці неправідловай выплаты за працу, майстар-фашыст крычаў „прагонім з фабрыкі вон, на кожнага месца за брамай чакае 25 беспрацоўных».

Рабочыя абвясьцілі забастоўку і выставілі патрабаваньні аб звальненьні майстра і падвышэньня заробнай платы.

Гаспадар на забастоўку адказаў нёкаўтам, адмовіўшы ўсім рабочым у працы. Фабрыку ахраняе паліцыя, дзе працуе некалькі чалавек штрэйкбрэхэраў".

«Роботнік».

Катаржны прыгавор.

ВІЛЬНЯ, 17-9. Учора Віленскі апэляцыйны суд разглядаў справу селяніна вёскі Забродзьдзе Сымона Бароўскага, якога пракуратура абвінавачвае ў прыналежнасьці да кімуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Пасьля «перагляду» гэтае справы апэляцыйны суд зацьвердзіў прысуд першай інстанцыі 6 год катаргі.

Газэта манархістаў «Слово» стараецца заспакоіць сваіх чытачоў тым, што «агітацыя камуністаў ня мае посьпеху, бо агітатары не інтэлігэнты, а рабочыя і сяляне, якім больш да твару працаваць з малаткам, сякерай, ці рыдлёўкай, чым займацца палітыкай».

Але гэтае «заспакаеньне» зьмяняецца перапудам перад нарастаючай рэвалюцыйнай хваляй, перад дням распаты «палітыкаў з малаткамі і сякерамі» са сваімі эксплёататарамі.

Беларускія хадэкі аб „адзінстве".

ВІЛЬНЯ, 16-IX. Беларускія хрысьціянскія дэмакраты выказаліся ў сваім органе «Крыніца» за ўвядзеньне кірыліцы (славянскага альфабету) у беларускай мове, матывуючы патрэбай захаваньня адзінства беларускай культуры.

Польскія колы спаткалі гэта патрабаваньне варожа.

Да суровай адказнасьці шкоднікаў.

МАСКВА, 16-9. Прэзыдыум УсеМБІТ парашыў паставіць праз УсеЦСПС, перад урадам пытаньне аб тым, каб прыцягнуць да адказнасьці ня толькі актыўных удзельнікаў шкодніцкай арганізацыі ў Суднатрэсьце, але і дырэктара і завадзкі камітэт супольна з бюро інжынэрна-тэхнічнага калектыву суднабудаваньні.

Усе кіруючыя арганізацыі, якія дапусьцілі да ўтварэньня абставін, якія дапамагалі шкоднікам актам, павінны панесьці суровае пакараньне.

ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ НА ФРОНЦЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА НАСТУПУ.

Скончылася першая Маскоўская абласная партыйная канфэрэнцыя, якая паклала фундамант новай адзінкі нашай партыі—Маскоўскай абласной арганізацыі УсеКП(б). Канфэрэнцыя найбуйнейшай арганізацыі нашай партыі, выказваючы волю амаль 300000 бальшавікоў, ухваліла палітычную лінію і працу Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б)—працу, якая праходзіла ў надзвычайна складаных і цяжкіх абставінах мінулага году. Канфэрэнцыя адзначыла, што пад кіраўніцтвам ЦК наша партыя, бязумоўна, дасягнула буйных посьпехаў у справе індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі. Вынікі гаспадарчага году сьведчаць аб поўным і гаслушным правале правых апартуністаў, яшчэ раз пацьвердзілі нагібельнасьць шляху, на які сталі правыя элементы.

Трэба проста сказаць, што ніводная арганізацыя не правальвалася так хутка, як права-апартуністычная, ушчэнт разьбітая жыцьцём, посьпехамі партыі на фронце сацыялістычнага наступу. Ужо першы год пяцігодкі паказаў, што тэорыя правых аб раўненьні «на вузкія месцы», зьяўляецца ў выніку неадацэнкі тых вялізарных нескарыстаных яшчэ магчымасьцяў і рэзэрваў, якія зьмяшчае ў сябе сыстэма савецкае гаспадаркі. Не раўненьне „на вузкія месцы", а рашучая перамога іх—вось вынікі апошняга году.

Магутнае разгортваньне калгаснага руху, утварэньне буйных савгасаў, правядзеньне кантрактацыі, рост пасеўных плошчаў у сацыялістычным сэктары і індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках разьбілі нікчэмныя прароцтвы правых аб дэградацыі сельскай гаспадаркі. Актыўнасьць рабочае клясы і партыі, якая хутка і сыстэматычна ўзрастае, шырока разгорнутае сацыялістычнае спаборніцтва, узмацненьне пралетарскай самакрытыкі і г. д.—зьявіліся дасканалым адказам на паклёп правых аб зажыме мас, бюракратызацыі партыі, цяжкім унутрыпартыйным рэжыме.

Сама канфэрэнцыя, якая адбывалася на базе разгорнутай самакрытыкі і вызначалася высокай палітычнай актыўнасьцю, сьведчыла аб палітычным росьце нашай партыі, адмаўляць які могуць толькі людзі засьляпёныя фракцыйнай барацьбой і нявер'ем у тую вялікую справу, якую з напружаньнем, пад кіраўніцтвам партыі, праводзіць рабочая кляса. Канфэрэнцыя пагэтаму асабліва завастрыла ўвагу на барацьбе з правым ухілам, галоўнаю небясьпекаю на даным этапе, запатрабаваўшы ад тав. Бухарына і яго аднадумцаў неадкладнага спыненьня барацьбы супроць лініі партыі і безагаворачнага правядзеньня ў жыцьцё ўсіх яе пастаноў, заявіўшы, што „невыкананьне гэтага патрабаваньня павінна пацягнуць ужыцьцё арганізацыйных вывадаў, намечаных пленумам ЦК, што адбыўся ў красавіку.

Абмеркаваўшы пытаньні міжнароднага камуністычнага руху, канфэрэнцыя з поўным аднадушшам асудзіла капітулянцкую ідэалёгію правых, цалкам салідарызавалася з пастановаю Выканкому Камінтэрну наконт таго, што крыкліва-апартуністычная абарона правага ўхілу в боку прымірэнцаў не сумясьціма з прабываньнем у Камінтэрне, і адназгодна ўхваліла пастанову Выканкому Камінтэрну аб вывадзе з Прэзыдыуму тав. Бухарына, які па сутнасьці стаў на пазіцыі правага ўхілу. Даўшы выразную і правільную ацэнку працы ЦК і МК, канфэрэнцыя асабліваю ўвагу завастрыла на асноўных палітычных і гаспадарчых задачах, якія стаяць перад партыяй і яе Маскоўскай абласной арганізацыяй.

Чырвонаю ніткаю ў пастановах канфэрэнцыі праходзіць пяцігадовы плян гаспадарчага і культурнага будаўніцтва вобласьці. Зразумела, што выкананьне пяцігадовага плану немагчыма без максымальнага ўцягненьня ў гэту справу шырокіх мас і перабудовы мэтадаў працы ў адпаведнасьці з новымі рэканструкцыйнымі задачамі. Канфэрэнцыя ў гэтым напрамку ўхваліла шэраг практычных мерапрыёмстваў; далейшае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва, далейшае ажыўленьне ўсіх форм масавай працы, падбор і падрыхтоўка кадраў ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Канфэрэнцыя заклікала ўсе арганізацыі і рабочую клясу да больш сур'ёзнай і паглыбленай барацьбы з бюракратызмам, чысткі дзяржапарату і сваіх уласных шэрагаў. (Трэба адзначыць, што чыстка дзяржапарату і партыйных шэрагаў праходзіць далёка нездавальняюча і патрабуе максымальнай увагі, як адна з важнейшых палітычных задач).

Вялікую ўвагу канфэрэнцыя аддала пытаньню разгортваньня самакрытыкі. Перад тварам складаных міжнародных і ўнутраных задач асабліва неабходна згуртаваньне і маналітнасьць партыйных шэрагаў, асабліва патрэбна рашучая барацьба за чыстату ленінскай лініі ў барацьбе на два фронты, як супроць правых апартуністаў, галоўнай небясьпекі на даным этапе сацыялістычнага наступу, так і супроць левага „фразёрства" у духу дробна-буржуазнага радыкалізму, які ўяўляе сабой рэцыдывы трацкісцкіх настроеў. Патрэбна ўпартая, бальшавіцкая, непрымірымая барацьба з апартунізмам і правай ідэалёгіяй на практыцы. Лепшым сродкам у барацьбе з правымі апартунізму зьяўляецца пралетарская самакрытыка. Вось чаму канфэрэнцыя правільна дала выразныя дырэктывы—больш шырока і глыбока разгортваць пралетарскую самакрытыку і рашуча змагацца з апартунізмам за партыйную лінію.

Вялікія задачы намеціла абласная партканфэрэнцыя. Іх можна вырашыць толькі высока ўзьняўшы сьцяг Леніна, сьцяг барацьбы з апартунізмам, цьвёрда ма гаючыся за лінію ЦК. Менавіта таму, што Маскоўская абласная арганізацыя цьвёрда стаіць на лініі партыі, зьяўляецца моцнаю апораю ЦК, менавіта таму яна пасьпяхова выканае намечаныя задачы, пойдзе наперад да новых перамог у барацьбе за сацыялізм.

(„Правда").

Хто дапамагае клясаваму ворагу.

Полацкія гаспадарнікі ўтвараюць умовы для абагашчэньня кулакоў і нэпманаў.

ГУРАГАННЫ АГОНЬ ПА ТЫХ, ХТО ПРАВОДЗІЦЬ ПРАВА-АПАРТУНІСТЫЧНЫ УХІЛ НА ПРАКТЫЦЫ.

„АСТРАХАНШЧЫНА" НА ПОЛАЧЧЫНЕ.

ГАНДЛЯРЫ І КУЛАКІ ПАД КРЫЛОМ КААПЭРАЦЫІ.

Акрсельсаюзам загатоўкі перададены прыватнікам-гандлярам.

ТРЭБА МОЦНА ЎДАРЫЦЬ ПА СУВЯЗІ ГАСПАДАРНІКАЎ З КУЛАЦКА-НЭПМАНСКІМІ ЭЛЕМЭНТАМІ.

Полацкія гаспадарнікі з некаторых гаспадарчых устаноў, бязумоўна, за рашучую барацьбу з правым ухілам, з правай небясьпекай, якая на практыцы перашкаджае і прыпыняе магутны тэмп сацыялістычнай рэканструкцыі нашай краіны. Гэтыя гаспадарнікі добра ведаюць, што правыя ўхілісты на практыцы дапамагаюць узмацненьню матар'яльнага дабрабыту нашага клясавага ворага. Але бяда ў тым, што іх разважаньні і перакананьні далёка разыходзяцца з практычнымі вынікамі працы.

Кулакі і нэпманы—растуць і гадуюцца.

Калі на словах яны за жорсткую і пераможную барацьбу з кулаком у вёсцы і нэпманам у горадзе, дык на справе і кулак і нэпман з іх лёгкай рукі растуць, гадуюцца, узмацняюцца, гавялічваюць свае капіталы.

Фактаў на Полаччыне, якія сьведчаць аб гэтым, можна знайсьці многа.

Нам прыходзілася пісаць аб тым, як Боркавіцкі РК КП(б)Б і РВК мінулага складу дапамагалі кулаку, шчыра праводзячы наркамземаўскую палітыку—хутарызацыі вёскі. Зараз мы прывядзём другія факты.

Полацкая акруга надзвычайна багата вялікімі вазёрамі, дзе разьвіты шырока рыбныя промыслы. Полацкі сельсаюз пайшоў насустрэч кулакам, даўшы магчымасьць апошнім абагашчацца пры дапамозе вазёр.

Полацкім сельсаюзам заснованы, па сетцы спэцыяльных відаў, дзьве рыбалоўныя арцелі.

Гэтыя арцелі арандуюць на ільготных умовах 59 буйных вазёр Полацкага, Вушацкага і Ветрынскага райёнаў.

У складзе Першай Ветрынскай арцелі 11 асоб але... з іх 5 чалавек зьяўляюцца крэўнымі сваякамі вядомага кулака Багунова „абранага" (як самы моцны кулак) старшынёй арцелі.

У другой Ветрынскай арцелі ёсьць 9 асоб, з якіх—6 членаў родзічы моцнага кулака Перапечкі, які таксама зьяўляецца старшынёй арцелі.

Па афіцыйных дакумантах, бязумоўна значна наменшаных, сям'я Багунова атрымала ў сваю карысьць 1532 рублі, а сям'я Перапечкі—за 5 месяцаў—1793 рублі. Што датычыцца не занесеных у кнігу прыбыткаў, дык мы ўпэўнены, што яны далёка перавышаюць прыведзеныя тут сумы.

Такія прыбыткі атрымоўваюць кулакі ў той самы час, калі паявы капітал першай арцелі складае 16 рублёў, а ў другой і такой сумы няма.

Выдаткі на... гарэлку.

Асобныя кулацкія сем'і накапляюць тысячы, а па касавых кнігах значыцца неразьдатак—1534 рублі і гэта толькі таму, што ня ўсе сумы прыходаваліся, а выдаткі запісаны без усякіх дакумэнтаў, „абы больш запісаць"...

У кнігах гэтых арцеляў можна бачыць і такія запісы: „5-II-28 году—выдаткавана 5 руб. 16 кап. на гарэлку"...

„19-1-29 году выдаткавана 9 руб. 04 кап. на гарэлку"... і г. д.

У арцелі бедната ня прымаецца, для іх дзьверы ў арцель зачынены, затое для сваякоў Перапечкі і Багунова райскае жыцьцё. Дзень працы ім залічваецца як два дні.

Полацкі РВК рады старацца для гэтых самеяк (арцеляў) і пры вучоце аб'ектаў абкладаньня адносіць да катэгорыі калектыўных аб'яднаньняў.

Гэтыя арцелі існуюць некалькі год, статуты іх зацьверджаны—ня гледзячы на існуючы закон (мы ўжо ня кажам аб клясавым падборы), што калі ў арцелі больш 30 проц. сваякоў, дык такая арцель ня можа быць аформленай.

Жывуць гэтыя арцелі гадамі, недзялімых капіталаў у іх няма, росту таксама, аграбаюць тысячу рублёў прыбыткаў на кожную сям'ю і радуюцца, што ў Полацкім сельсаюзе і РВК па настроях хоць і „чужыя", але на справе—„свае" людзі, якія спрыяюць ім.

Справу загатовак—у рукі гандляроў.

Полацкі сельсаюз не абмежаваўся толькі тым, што стварыў у межах сваёй дзейнасьці дзесяткі кулацкіх аб'яднаньняў, ён нават справу закупкі жывёлы перадаў у рукі гандляроў.

Полацкі сельсаюз, як бачыце, ня толькі ня лічыцца з дырэктывамі партыі і савецкага ўраду аб рашучай барацьбе з прыватным капіталам і выцясьненьні яго з рынку, а дапамагае праватніку ў набыцьці большых багацьцяў. Замест таго, каб загатоўку жывёлы праводзіць непасрэдна ад сялян, сельсаюз праз сетку сваіх супрацоўнікаў (да рэчы сказаць былых гандляроў) скупляе жывёлу ў перакупшчыкаў.

Гэтыя людзі гандлююць без патэнту, сельсаюз і ў гэтым ім дапамагае.

Намгас не адстае.

Да гэтага „букету" фактаў трэба дадаць яшчэ адзін факт. У Полацку ў акруговым цэнтры прыватнікі трымаюць гасьцініцы бяручы ад ложка тры, а то тры рублі 50 кап. у суткі,—у той час калі ў горадзе ёсьць камгас.

Аб гэтым усім ведае Полацкае РСІ і АВК, але нешта апусьціўшы рукі яны глядзяць на гэтыя злачынныя дзеяньні.

Трэба з усёй рашучасьцю ўдарыць па сувязі і цесным супрацоўніцтве асобных гаспадарнікаў з варожымі нам элемэнтамі. Людзі, якія парушаюць клясавую бальшавіцкую лінію, якія на справе ўхіліліся ад клясавай пралетарскай лініі, павінны быць пакараны.

Няхай аб гэтым ведае Полацкая АКК КП(б)Б, РСІ і акруговая пракуратура.

Ул. Пасрэбка.

Як ня трэба працаваць.

Партыйныя і савецкія арганізацыі кампанейскім парадкам праводзяць калектывізацыю.

Чаму распаўся калгас у в. Масьціщчы Полацкай акр.

Для нас не зьяўляецца новым, калі кулакі і заможнікі праводзяць агітацыю за сталыпінскі хутар, але для нас зьяўляецца дзіўным што калектывізацыя вёскі ў некаторых мясцох праводзіцца кампанейскім парадкам, ад выпадку да выпадку, што ідзе часам на карысьць клясаваму ворагу.

Возьмем, напрыклад, нашу Полацкую акругу. У асноўным за апошнія гады тут калектывізацыя вёскі пашырылася і прыняла шырокія разьмеры (Валынецкі райён), але побач з дасягненьнямі ў гэтай галіне ёсьць яшчэ значныя недахваты, аб якіх мы і будзем гаварыць.

Па пляну вясною гэтага году пачалося стопрацантнае вытворчае каапэраваньне трох сельсаветаў: Прудзінкаўскага, Жоўтінскага і Бабыніцкага. У час вясеньняй пасеўкампаніі ў памянёныя райёны былі кінуты самыя лепшыя сілы. Праводзілася вялізарная растлумачальная праца сярод сялянства з дакладамі аб калектывізацыі, падвышэньні ўраджайнасьці і інш.

У выніку было створана шэраг камун, калгасаў і сельска-гаспадарчых арцеляў. Плян па вытворчаму каапэраваньню выканан на 60 проц. Але што-ж атрымалася пасьля некалькіх месяцаў. Атрымалася вельмі дрэннае становішча.

Адбылося так сказаць, „парадное шествие»: прамовы, даклады, гутаркі, выступленьні, агітацыя. Сяляне зразумелі карысьць калектывізацыі. А потым... потым усе разьехаліся, сілы былі перакінуты на другія гаспадарчыя фронты. Створаныя вясной калектыўныя гаспадаркі, не адчуваючы належнае падтрымкі, сыстэматычнага кіраўніцтва, пачалі распадацца. Толькі пасьля ўсе арганізацыі ўзварухнуліся і замацавалі калгасы. Не абышлося тут і бяз кулацка-варожай агітацыі за хутар.

Вясною па Вобальскаму сельсавету, Вульскага райёну, праводзілася праца па калектывізацыі вёсак. Адбываліся агульныя сходы, даклады, гутаркі. У выніку у в. Масьціщчы быў створан калгас з 13 гаспадароў. Праз некаторы час агітатары разьехаліся, больш ніхто не прыяжджаў з райёну. Пра калгас зусім забылі. Калгасьнікі ня ведалі з чаго пачынаць справу, кіраўніцтва адсутнічала. Гэты момант скарысталі кулакі і заможнікі. Яны разнасілі па вёсках розныя плёткі.

— Калгас накіне для вас пятлю на шыю,—гаварылі заможнікі.

— Вас вагітавалі, а потым забылі,—крычалі кулакі.

Словам ад кулацка-заможніцкай агітацыі калгас разваліўся. Цікава ведаць-хто-ж быў галоўным агітатарам у разлажэньні калектыўнай гаспадаркі? Вялікую актыўнасьць у гэтай справе праявіў кулак Лузгін Зьмітра, які мае 10 дзес. зямлі, добры сад, 4 жывёлы, добрую кузьню, трымае батрачку і карыстаецца сэзоннай наёмнаю сілаю. Ён першым выступаў супроць калгасу, за сталыпінска-прышчэпаўскі хутар.

Далей ідзе, Лузгін Міхась, які мае 11 дзес. зямлі, 5 шт. жывёлы, 2 хаты, да рэвалюцыі быў буйным гандляром, карыстаецца зараз наёмнаю сілаю.

К вялікаму жалю ў час гэтай барацьбы (беднякі не хацелі выходзіць з калгасу). калі варожыя элемэнты разгортвалі сваю шкодную дзейнасьць, вульскія раённыя працаўнікі не заглянулі ў в. Масьціщчы, забылі пра створаны калгас. Гэта заможнікам і кулакам на руку.

Кампанейская калектывізацыя павінна спыніцца. Трэба праводзіць калектывізацыю вёскі сыстэматычна, плянава, узмацняючы створаныя новыя калгасы.

С. М.

Узоры галавацяпства ў мазырскіх установах.

За справу асеньняй пасеўкампаніі па Мазыршчыне ўзяліся адразу паўдзясятка ўстаноў. Мазырскія акрэа, акркалгассаюз і акрсельсаюз крычалі: —Ні аднаго фунта простага жыта не пасеем у гэтым годзе ў калгасах, толькі гатункове. Словы мазырскіх устаноў перасьпеўваліся райённымі і сельска-гаспадарчымі таварыствамі.

Увесь жнівень месяц належыць плянаваньню акрэа, акркалгассаюзу і акрсельсаюзу. 28 жніўня быў выдан апошні плян. Плян быў галавацяпскі, бо калгасам трэба было езьдзіць за 50-60 вёрст па насеньне ў другі калгас, а над бокам насеньне забіралася і везьлі некуды далей. Падругое, плян быў галавацяпскі яшчэ і таму, што акрсельсаюз ня ведаў, ці ёсьць насеньне ў тым ці іншым савгасе ці калгасе, а нарады туды даваў.

Для прыкладу возьму Даманавіцкі сельска-гаспадарчы райён. З савгасу „Ліпаў", які знаходзіцца ў 10 вярстох ад Даманавіч, насеньне адпраўлялася з гэтага савгасу цягнікам, а гарочыцкім калгасам вызначалася атрымаць насеньне ў м. Юравічы за 60 вёрст. Даманавіцкае т-ва дало нарад калгасу „Савецкая Беларусь" атрымаць 23 цэнтнэры насеньня ў калгасы «Чырвоны Араты". Паехаў прадстаўнік «Савецкай Беларусі» за 60 вёрст, а там насеньня няма. 10 р. 80 к. выдаткаваў і вярнуўся без насеньня.

— Што, ня далі вам насеньня?—кажуць у Даманавічах.—Мы іх за валакіту возьмем у работу. — А ў гэты час тэлеграма з Мазыра:—„Насеньне калгасам „Савецкая Беларусь" і Чырвоны Сьцяг трэба атрымаць у савгасе „Слабада", высылайце падводы. Запраглі калгасьнікі 10 штук коняй і паехаеі ў Мазыр, а адтуль меркавалі ехаць у Слабаду. У Мазыры ўжо ўзналі, што ў Слабадзе насеньня няма.

Галавацяпы мазырскіх акрэа, акркалгассаюзу і акрсельсаюзу плянавалі, пісалі бюракратычныя паперы ў РВК і сельск. гаспад. т-вы. РВК і сельска-гасп. т-вы выконвалі галавацяпскія распараджэньні, а самі нічога не рабілі і вось асеньняя пасеўкампанія зрываецца.

Вас. Дубовы.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Кулацкі тэрор.

Кулак зьбіў батрака.

Грамадзкасьць патрабуе суровага пакараньня для кулака.

Гомель, 19-9. *У вёсцы Васілевічы, Рэчыцкага райёну, кулак Белы разам з сваёй сям'ёй амаль да сьмерці зьбіў батрака Галоўка. Апошні дастаўлен у гомельскую больніцу. У яго адняўся язык, і ён наўрад ці будзе жыць.*

Трэба адзначыць, што кулак Белы ў працягу 10 год эксплёатаваў Галоўка і зьдзекваўся над ім. Былі нават спробы забіць яго. Галоўка зьвяртаўся за дапамогай у сельсавет, але не спаткаў належнага падтрыманьня з яго боку. І толькі ў апошні час справа была накіравана ў суд.

Кулак Белы і яго жонка затрыманы. Грамадзкасьць вёскі Васілевіч патрабуе суровай кары для кулака і яго сям'і.

ЗА 2-гі ДЗЕНЬ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ.

ГОМЕЛЬ, 19-9. Меркаваньне аб правядзеньні 2-га дню індустрыялізацыі сустракае гарачы водгук сярод працоўных. На буйных прадпрыёмствах акругі ўжо ўхвалены пастановы аб тым, каб адпрацаваць 25 сьнежня ў фонд індустрыялізацыі. Краўцы пастанавілі працаваць рэлігійнае сьвята «ейм-кіпур» і адпрацаваць 25 сьнежня ў фонд індустрыялізацыі.

За кошт пазыкі будуем новыя клюбы, рамантуем нардамы і бальніцы.

(Ліст з Полаччыны).

Пазыка ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі мае вялікае значэньне акрамя свае непасрэднай мэты многа і таму, што 10 пр. сумы, выручанай ад прадажы аблігацый, паступаюць у мясцовы бюджэт таго раёну, дзе распаўсюджвалася гэта пазыка. Гэтыя адлічэньні ідуць выключна на мясцовае будаўніцтва, на палепшэньне дабрабыту працоўнага насельніцтва.

Па нашай акрузе адлічэньні ад выручанай сумы рэалізацыі сялянскай пазыкі ўзмацненьня сельскай гаспадаркі складаюцца ў 10.998 руб., якія пайшлі ў раённы бюджэт. Цікава адзначыць—як праходзіць скарыстоўваньне гэтых адлічэньняў. Вось факты, якія яскрава кажуць пра вышэйпамянёнае.

Па Расонскаму раёну на ўстаноўку радыё, на абсталяваньне бібліятэкі і рамонт нардому скарыстана 380 руб., а на пабудову урачэбна-амбуляторнага пункту скарыстана 951 руб.

Па Дрысенскаму раёну на рамонт раённай сямігодкі скарыстана 704 руб., па Валынецкаму на пабудову аграпункту 1.139 р., па Асьвейскаму р-ну на рамонт сямігодкі 609 руб. і па Вульскаму р-ну на новую пабудову вэтлячэбніцы затрачана 1.047 руб.

У Вушацкім раёне скарыстана на рамонт райлячэбніцы 299 р., а таксама на здабыцьце сельска-гаспадарчых машын для пракатнага пункту 634 руб. Усяго па раёну скарыстана 933 руб.

Па Полацкаму райёну на рамонт школ у сельсаветах затрачана 504 руб. і грунтоўны рамонт вэтпункту у в. Сястронках 2.564 руб., што кажа аб вялікім дасягненьні.

На Лепельшчыне ўсяго скарыстана 1.289 руб., з гэтага ліку на праводку асьвятленьня клюбу 182 руб., райбальніцы 360 руб. і на шляхавае будаўніцтва 747 руб.

Ветрынскі район асаблівую ўвагу зьвяртае на культурнае будаўніцтва. На абсталяваньне, рамонт хат-чытален затрачана 330 руб., на абсталяваньне нардому 150 руб. і на аграпункт 398 руб.

Адсюль становіцца ясна якую вялікую карысьць прыносяць дзяржаўныя пазыкі ня толькі асобным сялянам, але і ўсяму будаўніцтву.

А.

СЛАБА РАЗГОРНУТА ПРАЦА ПА РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ.

Гомель, 18-9. Рэалізацыя 3-й пазыкі на сяле праходзіць вяла. На 15 верасьня ў акрузе сярод сялян распаўсюджана аблігацый пазыкі на 54250 руб. З гэтай сумы ў Брагінскім раёне пазыка разьмешчана на 1610 руб., Буда-Кашалёўскім—на 3345, Веткаўскім—на 4500, Гомельскім—на 13780, Рэчыцкім—на 5360, Камарынскім—на 3500, Церахоўскім—на 2300, Чэчэрскім—на 2905 руб., Хойнікскім—на 9920, Уваравіцкім—на 4500, Лоеўскім—на 2530 рублёў.

Гэтыя лічбы аб рэалізацыі пазыкі сьведчаць аб тым, што раённыя арганізацыі ня кіруюць падпіскай на пазыку, Камісіі садзейнічаньня распаўсюджаньню пазыкі бязьдзейнічаюць.

Культурныя сілы вёскі ня ўцягнуты ў працу па распаўсюджваньню пазыкі сярод сялян. У многіх хатах-чытальнях адсутнічаюць плякаты аб пазыцы.

Сацыялістычнае спаборніцтва па разьмяшчэньню пазыкі праводзіцца слаба. Няма належнага кантролю за выкананьнем узятых абавязацельстваў. Былі выпадкі, калі той або іншы сельсавет прымае выклік другога сельсавету на разьмяшчэньне пазыкі і не выконвае дагавор.

Акрфінаддзелам ужыты меры да таго, каб у райёнах узмацнілася праца па разьмяшчэньню пазыкі. Кантрольныя лічбы па рэалізацыі пазыкі павінны быць выкананы.

Сарваліся кулацкія закіды.

(Крычаўскі райён, Магілеўшчына).

У вёсцы Міхеевічы летась праводзілася земляўпарадкаваньне. Тады мэтай пастаўлена было—стварыць калектыўную гаспадарку.

Кулакі павялі шалёную агітацыю супроць. Падпалы, пагрозы—усялякія захады ўжывала заможная частка Міхеевіч, каб толькі перашкодзіць арганізацыі калгасу.

Але іхныя хітрыкі не ўдаліся. Нядаўна стварыўся ў Міхеевічах новы калгас —з 40 двароў. Калгасьнікі ўзаралі ўжо азімы клін і засеялі яго чыста-гатунковым насеньнем.

Індустрыялізуем калгасы.

Гомель 18-9. Водлуг кантрольных лічбаў калгасаюзу ў будучым годзе мае быць выдадзена 570 тысяч руб. на індустрыялізацыю калгасаў. У калгасах акругі будуць пабудаваны 9 бульбяна-тарачных заводаў, 5 заводаў па пераапрацоўцы малочных прадуктаў, 2 маслазаводы, 7 майстэрняў па рамонту сельскага інвэнтату, 3 заводы па пераапрацоўцы садавіны, 3 маслабойных заводы, 3 млыны і крахмальны заводу камуне імя Крапоткіна.

Вінаваты гаспадарнікі.

ГОМЕЛЬ, 16-9. Згодна папярэдніх вынікаў каштоўнасьць выпушчанай прадукцыі ў 3-й квадры бягучага году зьніжана на 11,3 проц., што дае эканомію ў 593.100 рублёў.

Процант зьніжэньня сабекошту быў-бы яшчэ большы, калі-б гаспадарчыя органы перабудавалі свае пляны ў адпаведнасьці інтэнсыўнай працы, якую выяўляюць рабочыя. На большасьці прадпрыёмстваў прыкмячаецца няўвязка паміж цэхамі. На заводзе „Пралетары" заводкіраўніцтва прапанавала рабочым сьлесарнага цэху замарудзіць тэмп сваіх работ, з прычыны таго, што другі цэх не спраўляецца.

На гуце „Катпраца" з-за адсутнасьці сыравіны, прымушана была не працаваць бачарнае аддзяленьне з 22 рабочымі.

На запалкавых фабрыках у Рэчыцы гаспадарнікі арыентавалі масы аб немагчымасьці выкананьня вытворчых праграм.

На прадпрыёмствах Жылсаюзу ўда гэтага часу ня робяцца адлічэньні тых процантаў, якія рабочыя абавязаліся аддаць шляхам перагляду расцэнак.

Гэтыя факты яскрава гавораць аб тым, што гаспадарнікі мала робяць у галіне сацыялістычнай рацыяналізацыі. Рабочыя характырызуюць гэта становішча наступным чынам: мы ўздымаем вытворчасьць працы, выконваем свае абавязацельствы, а гаспадарнікі стаяць у баку. Трэба гэткіх кіраўнікоў прыцягваць да адказнасьці.

Асьветнікі гатовы абараняць чырвоныя межы СССР.

Полацак, 18-9. Гэтымі днямі адбылася пашырая канфэрэнцыя ўсіх асьветнікаў Дрысенскага раёну, на якой апрача іншых пытаньняў стаяла і займала належнае месца пытаньне адносна апошніх міжнародных падзей.

Пасьля інфармацыі сэкратара райкому партыі аб наглых нападах на Кіт.-Усх. чыгунку, на савецкую мяжу, асьветнікі далі абяцаньне, што яны першымі выступяць абараняць СССР. Там-жа была вынесена пастанова аб адлічэньні 1 пр. на карысьць абароны краіны і 21 чал. запісаліся дабраахвотна ў шэрагі Далёка-Ўсходняй армії.

Апрача гэтага, асьветнікі Дрысеншчыны за апошнія часы пачалі ўзмацняць працу вайсковых гурткоў, асовіахімаўскіх яч.

Кулакі ўзмацняюць сваю дзейнасьць супроць калгаснага будаўніцтва.

ГОМЕЛЬ, 19-9. Кулакі ўзмацняюць сваю антысавецкую дзейнасьць супроць калгаснага будаўніцтва. У Брагінскім райёне кулакі падпалілі отог сена ў 500 пудоў, належачы калгасу „Чырвоная Гаспадарка".

Мэдычная дапамога пашыраецца.

Гомель, 18-9. Мэдыцынская дапамога насельніцтву палепшаецца. У гэтым годзе бальнічная сетка пашырана, будуюцца новыя лекавыя ўстановы. На будучы год будзе асыгнавана 194 тысячы руб. на новае бальнічнае будаўніцтва і на капітальны рамонт лекавых устаноў. Апроч пашырэньня мэдустаноў, выдаюцца сродкі на пабудову дзіцячых ясляў. У новым гаспадарчым годзе будуць пабудаваны будынкі для ясляў у Гомелі і Рэчыцы.

Вялікія сродкі на будаўніцтва мясцовай прамысловасьці.

Ворша, 18-9. На новае будаўніцтва, на капітальны і дробны рамонт і на пераабсталяваньне па мясцовай прамысловасьці ў будучым гаспадарчым годзе па Аршанскай акрузе будзе выдаткавана 1.234.500 руб. За гэтыя сродкі будуць пабудаваны: два тарфяных заводы, два цэгляных, адзін вапенны, крухмальны, кансэрвна-фруктовы завод і электрастанцыі ў Мсьціслаўлі, Горках, Дрыбіне, Талочыне. Некаторыя з гэтых станцый ужо будуюцца. За гэтыя сродкі будзе праведзена пераабсталяваньне асьвятлільнай сеці ў Воршы, Копысі і Дуброўне для атрыманьня току з Асінбуду. Таксама будзе праведзена пабудова асьвятлільнай сеткі па сельскай электрафікацыі.

Памянёныя вышэй сродкі будуць часткова выдзелены з мясцовага і дзяржаўнага бюджэтаў, з фондаў прамысловасьці і амартызацыі і пазыкі Белкамунбанку і Белсельсбанку.

Раённыя выстаўкі пад пагрозай зрыву.

Полацак, 18-9. Падрыхтоўчая праца да раённых сельска-гаспадарчых выставак, якія павінны адбыцца 22 верасьня, праходзяць вусім слаба. Вакол гэтага пытаньня ня створана грамадзкай думкі. Адчуваюцца казённыя адносіны да справы. Райвыстаўкомы адносяцца да справы дрэнна, фармальна. Падбор належных сельгас. экспанатаў праводзіцца слаба, асабліва сярод калгасаў і беднякоў-сялян.

Цікава адзначыць, што акруговы выставачны камітэт з вялікімі цяжкасьцямі склікаў першае арганізацыйнае пасяджэньне. Некаторыя акружовыя працаўнікі нават не знайшлі часу прыбыць на пасяджэньне. Яны вусім ня цікавяцца гэтай важнай справай.

Такія адносіны ставяць раённыя сельгас. выстаўкі пад пагрозу зрыву.

Хто яны такія.

„ЗАРЯ ЗАПАДА" ВЫКРЫЛА КУЛАКА НАРКАМСАБЕЗУ МАСАЛЬСКАГА І СЯБРОЎСТВА ЯГО З ПРЫШЧЭПАВЫМ.

На нядаўна адбыўшымся пленуме ЦК КП(б)Б было з усёй рэзкасьцю адзначана, што ў БССР на працягу раду гадоў праводзілася праваапартуністычная лінія ў зямельным пытаньні: стаўка на моцную кулацкую гаспадарку, насаджэньне „сталыпіншчыны", процідзейнічаньне справе калектывізацыі.

У асобе Лабаноўскага, Прышчэпава і іншых партыйная грамадзкасьць, нарэшце, выкрыла «канкрэтных насіцелаў зла». Яшчэ да XII зьезду КП(б)Б, калі на прахадзіўшых па ўсёй БССР акруговых партыйных канфэрэнцыях (у прыватнасьці і на **V Віцебскай акрпартканфэрэн.**) радавыя партыйцы поўным голасам загаварылі аб „кулацкім ухіле" у вышэйшай калегіі зямельнага кантролю Наркамзему.

Прышчэпаў і яго сябры прабавалі „втирать очки", гаворачы аб тым, што друк „раздувае" гэтае пытаньне. Яны запэўнівалі аб сваёй „адданасьці" генэральнай лініі партыі. Людзі, што кляліся рашэньнямі 15 зьезду партыі, выходзіць, трымалі камень за пазухай, бо ў сваёй асобнай ад партыі лініі правыя ўхілісты з Наркамзему садзейнічалі ўзмацненьню эканамічнай моцы кулацтва і гэтым самым, у выніку садзейнічалі ўзмацненьню росту палітычнай актыўнасьці кулака.

Такім чынам, сыстэма насаджэньня адрубаў, палітыка надзяленьня хутарамі, па сваёй сутнасьці, была кулацкай палітыкай, адбіваючай у сябе думкі і тэорыі правых ухілістых.

Простыя насіцелі зла з кіруючай работы ў Наркамземе зьняты, але, як спадчына, нам засталіся насаджаныя ўсюды ў аграмаднай колькасьці хутары, рэзка павялічыўшыя прыватна-капіталістычны сэктар на вёсцы.

Цяпер з упэўненасьцю можна сказаць, што з выхадам „галоўных капэльмайстраў"—Прышчэпава і Лабаноўскага,—хор праваўхілісцкіх падпявалаў некалькі расстроіўся, але яшчэ сярод застаўшыхся чутны паасобныя галасы, якія яшчэ цяпер цягнуць свае рэзкія ноты. Паколькі мы гаворым аб тых, хто „цягне высокія ноты", трэба для яскравасьці зьвярнуцца некалькі назад да 1918 г., калі маладая краіна саветаў толькі заключыла Берасьцейскі мір.

КРЫХУ ГІСТОРЫІ.

Калі ўважліва прасачыць «радаслоўную» некаторых б. працаўнікоў Наркамзему, дык перш за ўсё кідаецца ў вочы тое, што ўсе яны ў мінулым зьяўляюцца правымі эсэрамі. Гэта яны ў пэрыяд заключэньня Берасьцейскага міру, як актыўныя члены эсэраўскай арганізацыі, узьнімалі паўстаньні супроць савецкай улады. Мы ведаем, што ў гэты час эсэраўскі рух быў асабліва моцны у Сеньненскім павеце б. Віцебскай губэрні. У склад рэвкому ўваходзілі эсэры: Прышчэпаў, два браты Дземянці, Паўлоўскі, Каваленка (зусім нядаўна кіраваў Віцебскай акрзямкамісіяй), Масальскі і інш. Пасьля Берасьцейскага міру гэта група павяла шалёную кампанію. Яна па дырэктывах эсэраўскага цэнтру, вяла ліхаманкавую падрыхтоўку да паўстаньня. У кіруючы штаб увайшлі эсэры: Паўлоўскі, Каваленка, Масальскі, Закрэўскі, Прышчэпаў, былы стражнік, а зараз—спэкулянт Юроўскі, настаўнік Казак (працуючы зараз у Наркамасьветы), былы афіцэр—дваранін Слуцкі і інш. Штаб знаходзіўся ў вёсцы Лагыголь, у хаце Масальскага, які супольна з Закрэўскім і Юроўскім кіраваў паўстаньнем. Сяляне, справакаваныя гэтай групай людзей, зрабілі напад на нямецкія часьці, у выніку чаго было расстраляна і забіта шмат сялян. Паўстаньне эсэраў было задушана Чырвонай гвардыяй і атрадамі ГубЧК. Пасьля гэтага Масальскі і Прышчэпаў судзіліся. Адзін з відных кіраўнікоў паўстаньня Паўлоўскі зьнік.

Пасьля паўстаньня Прышчэпаў нейкім чынам пралазіць у партыю і за кароткі, параўнаўча, тэрмін высоўваецца на адказныя пасты, а яго «сподвижник» Масальскі працуе ў сваёй гаспадарцы, прычым, пад кіраўніцтвам гэтай асобы праводзіцца зямляўпарадкаваньне і, вразумела, Ігнату Масальскаму адводзіцца лепшы кавалак зямлі. Потым, мы бачым Масальскага членам сельсавету, каапэрацыйным працаўніком, пасьля райёнаваньня Віцебскай акругі ён выбіраецца членам РВК, прымае ўдзел у акруговым і ўсебеларускім зьездах саветаў, выбіраецца ў члены ЦВК БССР, а зараз мы бачым яго на пасту Наркамсабезе БССР.

«ТОЛЬКІ ТРАКТАРА НЕ ХАПАЕ».

Нарком Масальскі мае тыповую кулацкую гаспадарку. Да рэвалюцыі ён быў уласьнікам 24 дзесяцін зямлі, вялікай колькасьці жывёлы і даволі багатага інвэнтару. Пасьля рэвалюцыі і праведзенага савецкай уладай зямляўпарадкаваньня, яго гаспадарка крыху абрэзана, але ўсё-ж у яго засталося больш 17 дзесяцін добрай зямлі, 3 каровы, 2 кані, ня лічачы дробнай жывёлы і шматлікага інвэнтару. Ігнат Масальскі—нарком—штогодна **наймае пастуха, трымае батракоў.** У 1925 г., каб менш плаціць падатку, ён робіць **фіктыўны падзел гаспадаркі** і дагэтуль, ня гледзячы на тое, што жыве фактычна з бацькам, падатак плаціць асобна.

Беднякі-сяляне кажуць, што за час прабываньня Масальскага ў Менску, яго гаспадарка настолькі акулачылася, што «ТОЛЬКІ ТРАКТАРА НЕ ХАПАЕ». Кожнае лета на гаспадарцы Масальскага працуе каля 50 ч. сэзоннікаў, ня ня лічачы сталых батракоў. Сельска-гаспадарчы інвэнтар **за плату** адпушчаецца сялянам, **лішкі хлеба дзяржаве не здаюцца, фіктыўна падзеленая кулацкая гаспадарка Масальскага плаціць падатку... 92 руб. у год.** Вясной бягучага году Масальскі сваю сям'ю перавёў у Менск і ўсё-ж гаспадарку пакінуў за сабою, а для вядзеньня яе **наняў батрака.** Цяпер у сялян зьявілася новая прыказка: **„ШЧАСЬЦЕ, ЯК У ЧЛЕНА ЦВК"...**

НАМ, ВЫЛУЧЭНЦАМ, ТУГА ПРЫХОДЗІЦЦА"...

Нарком Масальскі—часты госьць у вёсцы. Апрача адпачынку, ён зусім нярэдка прыяжджае да сваіх сваякоў-кулакоў, каб „вкусить" самагону, як гэта было, напрыклад, на вясельлі ў кулака Мурашкі, дзе нават была бойка і наркому ўласнай асобай прышлося разьнімаць п'яных кулакоў.

У час гэтых прыездаў, ён вядзе „па душах" гутарку з сялянамі і часта скардзіцца за свой лёс. Вось што гаварыў ён летам у мінулым годзе ў гутарцы в нашым селькорам Вораневым:

— „Нам, вылучэнцам, таксама цяжка прыходзіцца. Трэба ўсім дагаджаць. Нашы вылучэнцы на сходах у Менску як пачнуць гаварыць праўду, дык іх адразу „задвигают". Я-ж імкнуўся не спрачацца і, праўда ці няпраўда, —але згаджаюся з імі, за што мяне і любяць. Галоўным чынам, я зьвязан з Прышчэпавым, а ён усюды—за мяне адстойвае маю кандыдатуру. Калі Прышчэпаў яшчэ будзе членам ЦВК, дык я спадзяюся, таксама буду працаваць".

Хто гэта гаворыць? Нарком!!!

«КАЛГАС—СПРАВА ДОБРАЯ, АЛЕ ХУТАР ЯШЧЭ ЛЕПЕЙ».

„Зьвязда" калісьці пісала аб тым, як незаможны селянін, прысутнічаўшы на адкрытым сходзе ячэйкі, пасьля таго, як слухаў прамову Лабаноўскага, быў настолькі абураны, што адразу сказаў: „У нас так выступае кулак, а тут—вось табе якія разважаньні». Гэты селянін сваім клясавым чуцьцём пачуў у Лабаноўскім ворага беднаты.

Нарком Масальскі таксама на сялянскіх сходах выказваецца і гаворыць сялянам, што „калгас —справа добрая, але хутар яшчэ лепш"...

23 красавіка 1929 г. у Сянно адбываўся райённы зьезд саветаў, на якім Масальскі выступаў **са справаздачай ураду БССР.**

Замест таго, каб завастрыць пытаньне аб калектывізацыі, ён моўчкі абыйшоў яго. Праўда, штосьці казаў, але так няясна, што гэта выклікала бурныя спрэчкі. Шмат дэлегатаў выступілі і «крылі» наркома за тое, што **ён на ўласным прыкладзе скажае лінію партыі—акулачыўся і ня хоча ісьці ў калгас.** Адна батрачка дэлегатка зьезду ў сваёй прамове сказала:

— „Хоць Масальскі і член ураду, але ён зрабіў фактычны падзел гаспадаркі, ён супроць калгасаў, ён не здае лішкаў хлеба дзяржаве".

Як бачыце, абвінавачаньні супроць наркома былі высунуты даволі цяжкія, усе спрэчкі, у асноўным, вяліся вакол гэтага пытаньня.

Што-ж адказваў у сваім заключным слове нарком?

Ён, бачыце, даў „урачыстае абяцаньне" сялянам:

— Я падумаю, і мабыць увайду ў калгас.

Сяляне, як гэтага і трэба было чакаць, нездаволеныя яго паводзінамі, кандыдатуру Масальскага ў члены РВК нават і ня высунулі.

АБ ПРЫШЧЭПАВЕ І ЯГО СЯБРОХ.

Вышэй ужо адзначана, што Масальскі зьяўляецца „сподвижником" Прышчэпава. Адсюль стане зразумелым, чаму былы сеньненскі гарадзкі галава Апалінары Гарнак—уласьнік аграмаднага саду і двух дамоў (цесьць Прышчэпава), па рэзалюцыі Масальскага атрымоўвае пэнсію ў 30 з лішкам рублёў і плюе на ўсе пратэсты мясцовых арганізацый. А другі „сподвижник" Масальскага і Прышчэпава—настаўнік Казак, які ў часе паўстаньня, сумесна з белагвардзейцам Слуцкім, расстрэльваў чырвонагвардзейцаў, зараз працуе ў Наркамасьветы „на ніве асьветы" ў тых бальшавікоў, якім ён калісьці «паказваў Масква». Яшчэ адзін гэрой паўстаньня Дзімянцей прыстроіўся ў Наркамземе, але падвёў свайго сябра Прышчэпава і цяпер сядзіць у папраўчым доме за растрату.

Характэ

ДАРОГУ ХЛЕБУ

ПЛЯНАВАСЬЦЬ І АРГАНІЗАВАНАСЬЦЬ ЗАМЕСТ САМАЦЁКУ

Па руках тым, хто скрыўляе клясавую лінію ў справе хлебазагатовак.

Сваечасова правядзем хлебазагатоўкі.

Больш рашуча разгарнуць хлебазагатоўкі.

КУЛАКІ І ПАДКУЛАЧНІКІ СПРАБУЮЦЬ САРВАЦЬ ХЛЕБАЗАГАТОЎЧУЮ КАМПАНІЮ. „ПРОХЛАДНЫЕ" АДНОСІНЫ ДА ЗАГАТОВАК РАЙВЫКАНКОМАЎЦАЎ.

(Ліст з Мазыршчыны).

Пляны хлебазагатовак бягучага году ў Мазыршчыне ўжо абгаварваўся ў акруговым цэнтры, у райёнах і ў многіх пленумах сельсаветаў. Большасьці сельсаветаў утвораны былі камісіі садзейнічаньня па хлебазагатоўках. Амаль па ўсіх вёсках былі праведзены сходы беднаты, многія супольныя сходы беднаты і сяродняку. На гэтых сходах абгаворваліся пляны хлебазагатовак па ўсіх насельніцкіх пунктах. Трэба сказаць, што настрой беднаты да хлебазагатовак вельмі добры. Пры ўмовах вельмі добрых. Пры ўмовах хлебазагатоўчых пляноў амаль усюды ўносіла карэктывы і сяе павялічэньня пляну.

Але кулацтва і падкулачнікі ўсялякімі спосабамі імкнуліся зрываць гэтыя мерапрыемствы і ўносіць перашкоды ў працу па выкананьню плянаў загатовак, бо кулацтва сьмела выяўляла кулацкія і ўказвала на захоўванне лішкі таварнага хлеба ў кулацкіх гаспадарках.

Пасьля прыняцьця сходамі пастановаў, вызначаючых загатоўчы плян, і ўтворанай камісіі садзейнічаньня разьбіраюць заданьні па асобных гаспадарках. Кулаччо і тут падымае свой голас, прыкідваючыся беднячкамі, і ня ведь хлеб раз у тыдзень у вочы кажуць. Але бедната і тут дае ім адпор, заўяляючы,—каб ты ня крыўдзіў дык запішыце і на нас па 2-3 пуды, мы іх здадзім добраахвотна.

Па ініцыятыве сялянскай беднаты і батрацтва ў першай дэкадзе верасьня па розных райёнах акругі ўтворана 7 чырвоных абозаў. Нельга не адзначыць таго факту, што пад сьцягам чырвоных абозаў спрабуюць „аддзелацца" 2-3 пуды хлеба, але на гэта зьвернута ўвага ўсіх мясцовых арганізацый. Ня больш таго, у Каралінскім раёне бедната адразу заўважыла куркульскія махінацыі і катэгарычна адмовілася ўзяць кулакоў у чырвоны абоз.

Для вас вызначана заданьне і вы павінны выконваць, а ў чырвоны абоз мы і без вас абыйдземся,—заявілі сяляне беднякі кулакам, спрабаваўшым прымазацца да абозу.

Працоўныя Мазыршчыны чырвоным абозам наладжваюць урачыстыя сустрэчы. На мітынгах сяляне заяўляюць, што ніводнага фунта хлеба не дадуць прыватнікам, а ўсе лішкі здадуць дзяржаве.

Нельга не адзначыць таго факту, што ў прымежных з УССР райёнах Мазыршчыны назіраецца наплыў мяшочнікаў-спэкулянтаў, якія скупаюць хлеб па павялічаных цэнах і вывозяць яго на лодках па Прыпяці. На мясцох ужо прыняты меры барацьбы з гэтымі дэзорганізатарамі хлебнага рынку.

У зьвязку з тым, што сялянства яшчэ занята на палявых работах, загатоўкі хлеба праз загатоўчыя арганізацыі праходзяць слаба. Мяркуецца іх разгарнуць у другой палове верасьня.

Зусім іншы малюнак у галіне памольнага збору: ён паступае здавальняюча і за ліпень-жнівень пляны выкананы поўнасьцю. Паступае нармальна памольны збор і ў верасьні. Усё-ж прыватнікі млынары спрабуюць сарваць гэту справу, яны ня спыняюцца нават і перад зачыненьнем млыноў на вядомы час, каб дабіцца зьмяншэньня заданьня.

Вялікай недарэчнасьцю зьяўляецца тое, што загатоўчыя арганізацыі не падумалі сваечасова аб пабудове складаў для хаваньня хлеба. Пытаньне са складамі на Мазыршчыне стаіць вельмі востра, а таму Саюзхлебу і каапэрацыйным арганізацыям трэба тэрмінова выправіць гэты недагляд і пабудаваць цэлы шэраг складаў.

У заключэньне спынімся на тым, што сярод некаторых працаўнікоў існуе вельмі лёгкі настрой да выкананьня хлебазагатоўчага пляну. Гэтыя таварышы—разважаюць «закідаем шапкамі», мы, „мол" выканаем хлебазагатоўчыя пляны без асаблівай гарачкі.

Такія разважаньні ў корані няправільны і з імі трэба рашуча пакончыць, зьвярнуўшы на разгортваньне хлебазагатоўчай кампаніі самую сур'ёзную ўвагу.

М-ч.

Узварушыць грамадзкую думку вакол хлебазагатовак.

Белкаапсаюз прымае ўдзел у загатоўцы ад індывідуальных гаспадарак у разьмеры 70 проц. пляну загатовак. На мясцох хлебазагатоўкі ўжо распачынаюцца. Сёлета яны павінны прайсьці больш плянава і больш актыўна, прычым хлебазагатоўкі павінны быць скончаны не пазьней лютага 1930 г. Наш апарат да хлебазагатовак падрыхтаваўся своечасова. Пачынаючы з мая, ва ўсіх акругах былі праведзены 2-хмесячныя курсы для працаўнікоў нізавых арганізацый. Апроч гэтага, пры ўсіх саюзах былі праведзены нарады прадстаўнікаў гандлёвых арганізацый.

У мінулым годзе ў часе хлебазагатовак нізавыя арганізацыі Белкаапсаюзу мелі справу выключна з індывідуальным прадаўцом, сёлета, наадварот, мы бярэм курс на калектыўнага здатчыка хлеба. Дзеля гэтага сярод насельніцтва праводзіцца растлумачальная праца аб выгаднасьці гэтага мерапрыемства. Пры такім спосабе здачы хлеба калектыўны здатчык мае права атрымаць на 50 проц. хошту здадзеных прадуктаў розныя дэфіцытныя тавары. Пры гэтым бярэцца пад увагу запатрабаванні сялянскага двара, які ўдзельнічаў у калектыўнай здачы хлеба.

Зараз Белкаапсаюз выпрацоўвае парадак прэміраваньня лепшых актывістаў, якія максымальна дапамагаюць у загатоўцы хлеба.

Тут, бязумоўна, адыгрывае вялікую ролю, наколькі той ці іншы селянін дапамагае растлумачэньню сярод сялянства значэньня калектыўнай здачы хлеба.

Тыя актывісты, якія ў выніку сваёй працы даб'юцца больш шырокай здачы хлеба па сваіх вёсках, атрымаюць у прэмію адрэзы на паліто, гадзіньнікі і г. д.

Ад лепшага растлумачэньня залежыць больш актыўная здача хлеба. Вось чаму сёлета пры загатоўцы хлеба трэба зьвярнуць пільную ўвагу на моманты грамадзкасьці, ставячы гэтыя пытаньні на кантроль грамады.

Б.

Неадкладна зьнішчыць бюракратычныя адносіны да хлебазагатовак.

За ліпень і жнівень у галіне хлебазагатовак па ўсёй БССР мы маем такія вынікі: загатоўлена непасрэдна ад сялянства 48,4 проц. пляну і памольны збор даў 146,3 проц. пляну. Наогул-жа хлебазагатоўчы плян за паказаныя месяцы выкананы на 112,7 пр.

Як відаць з паканых лічбаў агульны плян выкананы з правышэньнем, але за рахунак паступленьня памольнага збору. Амаль зусім адсутнічае здача хлеба савгасамі, калгасамі і кантрактантамі, між тым, як за апошнюю дэкаду жнівеня яны павінны былі займаць першае месца. Гэтыя арганізацыі трэба падцягнуць, бо яны, відаць, чакаюць тэрмінаў і „толкачей", неабходна зараз-жа зьнішчыць гэтыя казённыя, фармальныя адносіны да хлебазагатовак з боку аграмаданага сэктару.

Калі мы паглядзім на тое, як выканалі свае пляны загатоўчыя арганізацыі, дык прымушаны будзем сказаць, што ніводнае з іх ня выканала сваіх плянаў. Так, Белкаапсаюз за ліпень-жнівень выканаў плян на 53,6 проц., Белсельсаюз—на 44,4 проц., а Саюзхлеб усяго толькі на 34,4 проц.

Мясцовыя органы Народнага Камісарыяту Гандлю своечасова не сыгналізавалі перад мясцовымі партыйнымі і савецкімі органамі аб невыкананьні хлебазагатоўчых плянаў.

Уборка хлеба пачалася з першых дзён жніўня і яна ўжо даўно скончылася. Пачаўся ўжо абмалот хлеба,—аб гэтым сьведчаць лічбы паступленьня памольнага збору, а таму неабходна перайсьці ад слоў да справы.

Грош цана ўсім заявам аб праробленай падрыхтоўчай працы, калі гэта праца не дае належных вынікаў.

Партыйныя і савецкія органы округ павінны неадкладна праверыць, як выконваюцца іх дырэктывы і вызначаныя мерапрыемствы. Трэба прыцягнуць да адказнасьці асоб, якія зрываюць загатоўчую працу. Маючы на ўвазе, што ў параўнаньні з мінулымі гадамі верасьнёўскі хлебазагатоўчы плян па сваіх разьмерах вялізарны, трэба прыняць усе меры да самага шырокага разгортваньня хлебазагатоўчай кампаніі. Трэба перад загатоўцамі рашуча паставіць пытаньне аб поўным выкананьні гэтага пляну.

Мы маем весткі, што ў Менішчыне вясковыя камісіі садзейнічаньня часта абіраюцца з больш заможных і пры разьмеркаваньні плянаў загатоўкі паміж асобнымі гаспадаркамі далёка ня ўсе лішкі таварнага хлеба ўлічваюцца ў кулацкіх гаспадарках. Заможнікі спрабуюць пры разьмеркаваньні плянаў поўную колькасьць хлеба перакласьці на бядняцкія гаспадаркі. З гэтым трэба павесьці рашучую барацьбу. Мы бачым, што ў Аршаншчыне, Мазыршчыне і некаторых іншых мясцох паявіліся мяшочнікі-спэкулянты, якія дэзарганізуюць хлебны рынак, а на мясцох ня прымаецца належных мер.

Працаўнікі нашых загатоўчых арганізацый яшчэ далёка недастаткова ўсьвядомілі, што яны ня толькі прыёмшчыкі хлеба, але і непасрэдныя арганізатары грамадзкасьці навакол хлебазагатоўчай кампаніі.

Недастаткова растлумачана нізавым працаўнікам аб парадку прэміраваньня здатчыкаў хлеба прамтаварамі. Некаторыя працаўнікі спажывецкай каапэрацыі разважаюць, што ў першую чаргу прэміраваць здатчыкаў хлеба пайшчыкаў, а ўжо потым іншых.

Дырэктывы партыйных і савецкіх органаў яшчэ недастаткова ўсьвядомлены на мясцох, а таму падрыхтоўчая праца праведзена слаба і ў выніках мы маем шэраг недахопаў з першыхжа дзён загатоўчай кампаніі і слабое выкананьне плянаў загатоўчымі арганізацыямі.

С.

І падрыхтаваліся мы да загатовак.

Загатоўка семя лёну будзе выканана з перавышэньнем.

Пляны хлебазагатовак па лініі Белсельсаюзу на новы апэрацыйны год вызначана з непасрэднага збору ад сялянства і ад кантрактацыі і лішкаў у калгасах. Белсельсаюз прыступіў да рэалізацыі свайго заданьня.

Усе арганізацыі на мясцох падрыхтаваны да гэтай кампаніі. З Саюзхлебам заключаны дагаворы і ён непасрэдна фінансуе ўсе нізавыя арганізацыі с.-г. крэдытнай сыстэмы. Акрсаюзы робяць разьбіраў і забясьпечваюць нізавыя арганізацыі сродкамі ў разьмеры кошту месячных загатовак.

Мы ставім рубам пытаньне аб забясьпечаньні нас у поўнай меры мяшкамі. Ужо ў маі г.г. Белсальсаюз узьняў ініцыятыва перад Наркамгандлем аб завозе тары, але гэта пытаньне яшчэ і дасюль не атрымала вырашэньня. Каб ня было затрымкі з прычыны браку мяшкоў, мы высоўваем думку, каб Саюзхлеб зняўся гэтай справай і выдаваў патрэбную колькасьць мяшкоў.

Пры загатоўцы семя лёну Белсельсаюз рэалізуе каля 44 проц. вызначанага пляну. Па вестках, атрыманых з месц, можна ўжо сказаць з упэўненасьцю, што месячны плян на верасень будзе выканы з перавышэньнем.

Да загатоўкі валакна лёну мы прыступаем у кастрычніку.

Сродкамі на загатоўку лёну мы забясьпечаны поўнасьцю.

М.

КААПЭРАЦЫЯ ПЕРАД ЧАРГОВЫМІ ЗАДАЧАМІ

Толькі разгортваньнем самакрытыкі пайнікаў, ачысткай апарату ад былых гандляроў, спэкулянтаў і злачынцаў каапэрацыя ўзьніме сваю працу, ажыцьцявіць задачы каапэраваньня і калектывізацыі.

Вярхоўны суд павінен выправіць

1-га верасьня г. г. Аршанскі акруговы суд разглядзеў крымінальную справу Ходаскага спажывецкага таварыства аб сапсаваных ім 2000 пудоў вікі. Акалічнасьці справы наступныя:

У сьнежні 1928 г. Ходаскае спажывецкае таварыства па загаду „Дняпросаюзу" заготаўляла віку. Трэба адзначыць, што віка ў 1928 г. мела ў сябе вельмі многа вільгаці. У спажывецкім таварыстве адсутнічала памяшканьне для раскіданьня вікі тонкім пластом, і яна пачала псавацца. Прыказчык Гурэвіч аб гэтым падаў заяву ў праўленьне таварыства. Праўленьне з свайго боку напісала тэрміновую паперку ў „Дняпросаюз" з просьбаю даць нарад на адгрузку. „Днепрасаюз" маўчыць.

Будучы ў Воршы, загадчык гандлёвага аддзелу Мацьвееў дакладваў Гандлёваму Аддзелу „Дняпросаюзу", у асобе тав. Альперовіча, аб сапсаваньні вікі. Праз некалькі дзён Альпэровіч разам з упаўнаважаным Наркамгандлю Позьнякам наведаў Ходасы і абяцаў у тэрміновым парадку даць нарад на адгрузку вікі. Віка гніе, а нараду не даюць.

Т-ва дало тэлеграму „Дняпросаюзу", і сам загадчык Мацьвееў паехаў у „Дняпросаюз" з узорамі вікі, дзе і атрымаў нарад на адгрузку яе Магілеўскаму Сельсаюзу.

У Магілеве віка была абгледжана агранамам і аказалася, што яна не гадзіцца ня толькі на пасеў, а і на корм жывёле. Тады Альперовіч дае загад прадаць віку па 10 кап. за пуд. Даведаўшыся аб гэтым, Праўленьне Ходаскага спажыв. т-ва дало тэлеграму з просьбай не прадаваць віку і ў тэрміновым парадку прадало яе Янэўскаму бровару па 1 р. 10 к. за пуд. Тэлеграма не дапамагла, віка была прадана па 10 кап., і т-ва панясло 3.000 руб. страты.

Акруговы суд прыгаварыў: Мацьвеева—на 3 гады пазбаўленьня волі, прыказчыка Гурэвіча—на 1 г. 6 мес. Ну, а Альпэровіч? Вышаў сухім з вады, ня гледзячы на тое, што папярэдняе сьледзтва прыцягвала яго да крымінальнай адказнасьці, а на судзе Альпэровіч ужо фігураваў, як сьведка.

Судовая экспэртыза, складзеная з працаўнікоў АКРЗА і Хлебапрадукту ў сваіх выводах ускладае віну за папсаваньне вікі на 75 проц. на „Дняпросаюз".

Вярхоўны суд павінен выправіць памылку.

Зуеў.

Як таварыства рукамі гандляроў „дапамагае" калгасу.

Аб загатоўшчыку Даманавіцкага сельска-гаспадарчага т-ва Кантару ўжо пісалі ў газэце „Савецкая Беларусь", але не пра ўсё напісалі. Сёньня можам цьвёрда сказаць, што Кантар „дялец", якога трэба вычысьціць з каапэрацыі.

Калгас імя газэты „Савецкая Беларусь" атрымаў крадыт у суме 1000 р. на набыцьцё рабочай жывёлы. Загатоўшчык Кантар параіў калгасу купіць коні праз Даманавіцкае сельска-гаспадарчае т-ва.

Калгасьнікі паверылі прадстаўніку каапэрацыі, напісалі афіцыйную просьбу т-ву і паслалі разам з Кантарам свайго калгасьніка.

Прыехалі ў горад Канатоп. Кантар знайшоў нейкага другога Кантара, зваць яго Барысам і пайшлі на кірмаш купляць коні. Гэты Барыс прадставіўся агентам ДПУ, а на справе ён крымінальнік—сядзеў некалькі раз у папраўчым доме за кражу. Барыс купіў коні, прывёў доктара для вэтэрынарнага агляду, затрэбаваў вагон, заплаціў за яго і прынёс дублікат. Агулам усё зрабіў Барыс, а Кантар зьявіўся з дакладам у т-ва, што коні купіў, пагрузіў і ўжо едуць. Барыс вядома, працаваў не з прыхільнасьці: за сваю працу атрымаў, як належыць. У выніку ўсёй працы за чацьвёра коняй для калгасу заплацілі 819 руб., а калі бралі іх з Даманавіч, то прышлося аддаць 986 руб.

Можна дабавіць, што ў Даманавіцкім т-ве не адзін толькі Кантар, а кантары ёсьць і больш. Калгас „Савецкая Беларусь" узяў машыну—сеялку. Да гэтай машыны не хапае частак, і машына не працуе. Куды падзеліся часткі ад машыны, ніхто ня ведае і як відаць, ведаць ня хоча.

Ня шкодзіла-бы пракурору заняцца справамі таварыства.

Трэба, каму належыць, перасеяць праз рэдкае рэшата Даманавіцкае т-ва Кантары павінны выляцець у сьмеце.

Васіль Дубовы.

Букецік „каапэратараў".

Каапэрацыя Асьвейскага райёну, прышоўшы на чыстку савецкага апарату, бязумоўна, ня будзе чырванець перад іншымі. У каапэрацыі будзе шмат працы для камісіі.

Некалькі прыкладаў:

Шавецкая арцель „Труд". Па ініцыятыве старшыні там заўсёды п'янкі. Арцель атрымала некалькі футаў хрому ад Віцебскага саматужна-прамысловага саюзу, плаціла па 40 кап. за фут, а прадавала яго па 1 р. 40 к. Арцель зрабіла боты і расцаніла па 21 руб., а старшыня Качаў прадаваў іх па 25 руб., а запісваў па 21 руб.

Праўленьне падпісвае фальшывыя рахункі. За бярэсту плацілі па 2 руб., а па рахунках лічыцца па 4 руб.

Другім экспанатам гнязда былых гандляроў зьяўляецца спажывецкае таварыства. У мануфактурнай краме загадчыкам працуе былы гандляр Брусір. Загадчыкам мясной крамы—Піруцік, былы гандляр мясам, загадчыкам сталовай Кохан, былы ўласьнік піўной.

Б.

„І ваўкі сыты, І каровы цэлы".

А. Я. Лісакоў лічыў сябе і «людзі» яго лічылі „добрым" каапэратарам. Лісакоў быў загадчыкам крамы Н.-Максімавіцкага спажывтаварыства, Клічаўскага райёну, і працаваў, краў, пакуль не папаўся. Пры рэвізіі ў краме Лісакова аказаўся недахват і ён быў зьвольнен з працы. Лісакоў пачаў шукаць выхаду, каб зноў назваць сябе «добрым» каапэратарам, і знайшоў. Дзякуючы стараньню яго шваграра, старшыні рэвкамісіі, ён зноў—крамнік. Тут ужо Лісакоў сапраўды паразумеў, і недахопаў у яго краме зараз ніхто ня знойдзе.

Нова-Максімавіцкае спажывецкае таварыства далучана да Кабылянскага. Цяпер ужо крама Лісакова знаходзіцца ў адлегласьці 10-ці кілёмэтраў ад праўленьня.

Лісакоў ажыў: цяпер без кантролю і недахопаў ужо ня будзе. Замест таго, каб красьці тавары, ён цяпер узяўся за спэкуляцыю. Атрымае крама хлеб для раздачы беднаце—усё рукамі загадчыка крамы перадаецца на рынак да прыватніка.

Вынік працы досыць добры. Хоць бедната не атрымоўвае хлеба, затое прыватнікі маюць яго, а Лісакоў выходзіць сухім з вады—нажываецца, і ў краме ўсё на месцы.

Пракуратуры Клічаўскага райёну трэба зараз-жа заняцца дзейнасьцю Лісакова.

Палявы.

Яшчэ раз І мацней прачысьціць.

Склад працаўнікоў Дзэрнавіцкага спажывецкага таварыства падабраны з вялікай „стараннасьцю". Прымаючы пад увагу, што „бедната занята", склад падабран выключна з заможнікаў. Калі праводзіліся перавыбары праўленьня, кулакі—член праўленьня Шоран і Прохарэнка—падабралі гарлапанаў і падкулачнікаў, паілі іх гарэлкам і „актывізавалі" для ўдзелу ў перавыбарах. Вынік перавыбараў для Прахарэнка аказаўся досыць здавальняючым—членамі праўленьня аказаліся ўсе сваякі.

Член праўленьня Шоран мае моцную гаспадарку, трымае батрака без дагавору, пабудаваў зараз вялікую хату. Член праўленьня Прохарэнка такі-ж „старанны" гаспадар. Старшыня таварыства незаможнік, але слабахарактарны і цалкам знаходзіцца пад уплывам гэтых „дельцов".

Усе дэфіцытныя тавары ў т-ве атрымліваюць у першую чаргу сваякі членаў праўленьня і заможнікі, а беднаце адпускаюцца толькі астаткі.

Калі праводзілася чыстка каапэрацыйнага апарату, бедната ня была прыцягнута да гэтага і „дельцы" засталіся на месцы.

Трэба яшчэ раз прачысьціць склад гэтага таварыства і мацней.

Бядняк.

САВЕЦКАЯ ГРАМАДЗКАСЬЦЬ У ВЁСЦЫ І ХЛЕБАЗАГАТОЎКІ.

М. Чарноў.

ПАЧАЦЬ НОВАЙ ЗАГАТОЎЧАЙ КАМПАНІІ.

Нашым абавязкам у новую хлебазагатоўчую кампанію зьяўляецца скарыстаць дасягненьні мінулай кампаніі і выправіць недахопы, якія былі дапушчаны.

У новую хлебазагатоўчую кампанію мы ўступілі ва ўмовах больш спрыяльных, чымся гэта было ў апошнія кампаніі. Галоўнае гэта тое, што мы, усту...чы ў новую хлебазагатоўчую кампанію, ужо маем першыя вынікі практычнага правядзеньня ў жыцьцё дырэктыў партый аб рэканструкцыі і ўдыме сельскай гаспадаркі. Большая пасеўная плошча павялічыла супроць мінулага году амаль на 10 проц., граждайнасьць узьнялася. Ліквідаваны росту пасеўных плошчаў і ліквідаваньня ўраджайнасьці агульны аб'ём збор збожжа сёлета павысіўся супроць мінулага году. Будаўніцтва гаспадарак і калгасаў забясьпечыла ў іх большы рост валавага збору збожжа. Валавы збор збожжа ў савгасах павялічыўся супроць мінулага году на 11 проц., у калгасах—на 247,9 пр. Рост валавага збору збожжа ў савгасах і калгасах значна павышае ролю сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі ў плянавых загатоўках у 9,3 проц. у мінулым годзе да 16,0 проц. у новай хлебазагатоўчай кампаніі. У абсолютных лічбах разьмеры паступленьня хлеба ад савгасаў і калгасаў яшчэ не асаблівa значныя, але тэмп росту, які мы маем за адзін год, гаворыць пра тым, што практычнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі на сацыялістычную перабудову вёскі заключае нам у бліжэйшыя гады ...ваньне хлебных цяжкасьцяў апошняга часу. Хоць няпоўнае зьнішчэньне але поўнае зьмякчэньне хлебных цяжкасьцяў мы будзем ужо мець і ў новую хлебазагатоўчую кампанію.

Апроч росту паступленьня хлеба ад савгасаў і калгасаў, буйнае значэньне ў новай хлебазагатоўчай кампаніі мае і паступленьне хлеба ад індывідуальных гаспадарак па раней зробленых дагаворах,

Рост валавага збору хлеба, павялічэньне паступленьня хлеба ад сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі і закантрактаваны хлеб далі магчымасьць намеціць на новую кампанію павышаны супроць мінулага году плян загатовак.

Выкананьне гэтага пляну палегчаецца з другога боку, дзякуючы разьвіцьцю сацыялістычнага спаборніцтва ў прамысловасьці і эканоміцы выдаткаваньню прамтавараў у трэцім квартале. Мы атрымалі магчымасьць у пачатку новай хлебазагатоўчай кампаніі выпусьціць тавараў на сельскі рынак на 38 проц. больш, чымся ў мінулым годзе.

НАСТУП НА КУЛАКА І ХЛЕБАЗАГАТОЎКІ.

Вось якія надворныя станоўчыя ўмовы для разьвіцьця новай хлебазагатоўчай кампаніі. Аднак, якімі-б яны ні былі спрыяючымі, новая хлебазагатоўчая кампанія будзе праходзіць з няменшым напружаньнем сіл, чымся гэта было і ў мінулыя кампаніі. Супраціўленьне капіталістычных элемэнтаў у вёсцы і горадзе будзе ня менш заўзятым, чымся ў мінулым годзе. Ужо першыя месяцы новай хлебазагатоўчай кампаніі пераконваюць у гэтым з дастатковай поўнасьцю.

Каб мабілізаваць вакол хлебазагатовак бядняцка-сераднякіцкія сілы, трэба даць сельскай грамадзкасьці з самага пачатку хлебазагатовак канкрэтную задачу. Такой канкрэтнай задачай зьяўляецца давядзеньне гадавога пляну хлебазагатовак да сяла. Вакол клясава-правільнага выкананьня сельскага пляну і павінна быць арганізавана сельская грамадзкасьць.

Самым важным патрабаваньнем пры дачы гадавога пляну хлебазагатовак па асобным сёлам, зьяўляецца захаваньне максымальна магчымай правільнасьці пры разьмеркаваньні пляну паміж паасобнымі селішчамі. Да працы па выяўленьні таварных лішкаў неабходна прыцягнуць сельскія грамадзкія арганізацыі і асабліва групы беднаты і батрацтва. Толькі ў гэтым выпадку мы можам дабіцца правільнага разьмеркаваньня заданьняў па асобных сёлах і ўнутры сяла ня толькі з колькаснага, але і з клясавага боку. З прыняцьцем пляну сельскім сходам адначасна праводзяцца і арганізацыйныя мерапрыемствы, якія павінны забясьпечыць у далейшым выкананьне гэтага пляну.

Было-б недапушчальнай памылкай, калі-б сельскія грамадзкія арганізацыі пабудавалі сваю працу ў справе выкананьня сельскага пляну на чаканьні таго, што кулак дабрахвотна прадасьць свой хлеб дзяржаве без належнай арганізацыі націску на яго з боку бядняцка-сераднякіцкай грамадзкасьці. Выкананьне плянавых заданьняў кулакамі і заможнымі сялянамі можа быць забясьпечана толькі мерамі грамадзкага націску, эканамічнага байкоту і судовых рэпрэсій супроць тых, хто, спэкулюючы хлебам, не жадае прадаваць яго дзяржаўным і каапэрацыйным арганізацыям.

АРГАНІЗАВАЦЬ МАСАВУЮ ЗДАЧУ ХЛЕБА, ПРАВЕРЫЦЬ ЗДАЧУ ХЛЕБА САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ СЭКТАРАМ.

Для таго, каб уся маса сялянства, якая мае таварныя лішкі, прадала іх дзяржаве, трэба правесьці шырокую масавую растлумачальную працу на сяле.

Трэба са ўсёй рашучасьцю адзначыць, што з гэтага боку справа стаіць яшчэ ня зусім добра. Масавая растлумачальная праца разгортваецца марудна.

Паўтарамесячны вопыт новай хлебазагатоўчай кампаніі прымушае зьвярнуць увагу і на другі вельмі важны недахоп разгорнутых хлебазагатовак. Мы павінны атрымаць ад калгасаў і савгасаў і па кантрактацыі ад індывідуальных гаспадарак каля 40 проц. усяго гадавога пляну хлебазагатовак. Зараз назіраюцца такія настроі, што ўвесь гэты хлеб паступае без затрыманьня, і ня трэба прымаць рашучых мерапрыёмстваў, у тым ліку і па лініі масавай агітацыйнай работы, дзеля таго, каб паскорыць паступленьне гэтага хлеба. Такія настроі надзвычайна небяспечны. Яны сьведчаць аб адраджэньні старых надзей на самацёк. Зразумела, асноўная маса хлеба ад савгасаў і калгасаў да нас паступіць, але гэтага мала. Трэба, каб усе таварныя лішкі савгасаў і калгасаў паступілі дзяржаўным і каапэрацыйным арганізацыям. Пагэтаму сельскія арганізацыі ні ў якім выпадку не павінны пакідаць без увагі ў справе хлебазагатовак і сацыялістычны сэктар нашай сельскай гаспадаркі.

Хлеб закантрактаваны — гэта яшчэ не загатоўлены хлеб. Ён знаходзіцца ў руках індывідуальных сялян, і патрэбна вялікая арганізацыйная работа для таго, каб увесь хлеб па кантрактацыі быў перададзен дзяржаўным і каапэрацыйным арганізацыям.

На гэтых шляхох—націск на кулака, растлумачальная праца сярод сялянскіх мас, нагляданьне за продажам таварных лішкаў калгасаў і савгасаў, нагляданьне за здачай хлеба кантрактантамі—павінна разьвівацца праца па выкананьню гадавога пляну хлебазагатовак кожнага сяла.

Буйнейшае значэньне ва ўсёй гэтай справе будзе мець арганізацыя сацыялістычнага спаборніцтва між паасобнымі здатчыкамі хлеба асобнымі вёскамі і раёнамі.

Поруч з арганізацыйнай і растлумачальнай працай на сяле вакол хлебазагатовак асаблівую ўвагу трэба аддаць жанчыне-сялянцы.

З ліку сельскіх грамадзкіх арганізацый асабліва буйнае значэньне будзе мець праца комсамолу. Уся масавая і арганізацыйная праца на сяле будзе мець посьпех сярод сялянскай масы, калі самі вясковыя камуністы, камсамольцы і актывісты пойдуць наперадзе ўсёй сялянскай масы і гэтым дадуць прыклад іншым сялянам здаваць усе свае таварныя лішкі дзяржаве.

РАБОЧАЯ ГРАМАДЗКАСЬЦЬ І ХЛЕБАЗАГАТОЎКІ.

Асаблівае значэньне ў новую хлебазагатоўчую кампанію будзе мець устаноўленам форма сувязі рабочага з сялом шляхам спэцыяльных паездак рабочых брыгад на сяло:

Вопыт рабочых брыгад скарыстоўваецца і ў новую хлебазагатоўчую кампанію, праўда. не ў такіх разьмерах, як гэта патрэбна было-б, бяручы пад увагу значэньне хлебазагатовак, але і ў тых разьмерах, у якіх ён праводзіцца, ён будзе мець буйнае значэньне для посьпеху новай хлебазагатоўчай кампаніі.

Апроч арганізаваных форм сувязі паміж прамысловымі цэнтрамі і хлебаробнымі раёнамі, трэба скарыстаць і сувязь неарганізаваных форм якія ажыцьцяўляюцца адпускнікамі. Кожнае лета сотні і тысячы рабочых праводзяць свой адпачынак на сяле. Частка іх езьдзіць у хлебаробныя раёны. Кожны адпускнік-рабочы на сяле павінен стаць актыўным праваднікам усёй на шай палітыкі ў адносіне сельскай гаспадаркі і хлебазагатовак і актыўным арганізатарам беднаты і серадняку на сяле.

Шэфскія таварыствы, якія за апошні час значна ажывілі сваю працу па сувязі з сялом, на бліжэйшы час павінны паставіць хлебазагатоўкі ў цэнтры сваёй увагі. Магчымы і многія іншыя формы ўдзелу рабочых у хлебазагатоўках. Гэтыя формы павінны знайсьці самі рабочыя арганізацыі. Каб ня было распыленьня працы, прафсаюзы павінны паставіць кіраўніцтва справай удзелу рабочых у хлебазагатоўках. У мінулым годзе прафсаюзы надавалі справе хлебазагатовак недастатковую ўвагу. У новую кампанію іх адносіны трэба зусім зьмяніць. Зацікаўленыя ў бесперабойнай дастаўцы хлеба рабочым, каб ня было ў далейшым хлебных цяжкасьцяў для разьвіцьця прамысловасьці, прафсаюзы абавязаны разгарнуць шырокую працу па садзейнічаньню справе хлебазагатовак.

Растлумачальнай працы сярод чырвонаармейцаў павінна быць пастаўлена канкрэтная задача, каб кожны чырвонаармеец паслаў ліст у вёску сваякам і аднасяльчанам, параіўшы прадаваць хлеб дзяржаве і не прадаваць яго на прыватны рынак. Адпускнік-чырвонаармеец, выхаваны ў нашых ідэях, знаёмы з нашымі задачамі і мэтамі, вярнуўшыся ў сяло, будзе зьяўляцца адным з важнейшых арганізатараў бядняцка-сераднякіцкай грамадзкасьці ў справе хлебазагатовак.

УЗЯЦЬ НАЙБОЛЬШ ВЫСОКІЯ ТЭМПЫ.

Карэспандэнцкія зьвесткі, назіраньні рабочых брыгад і іншыя матар'ялы гавораць аб тым, што хлебазагатоўчы апарат, замест таго, каб абапіраючыся на сельскую грамадзкасьць, супольнымі сіламі дабівацца большага паступленьня хлеба дзяржаве, вядуць паміж сабой сварку з-за таго, каму з іх купіць хлеб у селяніна. Канкурэнцыя ў некаторых мясцох набывае самыя агідныя формы. У момант, калі кулак вядзе заўзятую барацьбу супроць хлебазагатовак, канкурэнтную барацьбу хлебазагатоўцаў нічым іншым, як шкодніцтвам, назваць нельга.

Наш хлебазагатоўчы апарат вельмі раскідан. Ажыцьцёвіць кантроль над яго працай толькі шляхам нагляданьня з боку дзяржаўных арганізацый фізычна немагчыма. Самі сельскія арганізацыі павінны паставіць пад свой кантроль працу хлебазагатоўчага апарату. У новую хлебазагатоўчую кампанію каапэрацыя будзе займаць 82,8 гадавога пляну хлебазагатовак. Праца каапэрацыі гэтым самым адыгрывае рашучую ролю ў посьпеху новай хлебазагатоўчай кампаніі. Канкрэтная задача, пастаўленая перад каапэрацыяй, складаецца з таго, каб, скарыстоўваючы свае сувязі з сялянствам і сродкі ўзьдзейнічаньня на яго, дабіцца таго, каб кожны пайшчык не прадаваў свой хлеб на прыватны рынак, а здаваў яго дзяржаве.

Пашыраны плян хлебазагатовак на новую кампанію маркуе і яго ўткае выкананьне. Канкрэтная задача выкананьня новага хлебазагатоўчага пляну пастаўлена такім чынам, каб выканаць гадавы плян хлебазагатовак не пазьней, чымся ў студзені ў паўднёвых і цэнтральных раёнах і не пазьней лютага—ва ўсходніх. Толькі справіўшыся з задачамі загатоўкі хлеба ў працягу першага паўгодзьдзя, мы зможам забясьпечыць выкананьне ўсяго гадавога пляну. Калі мы на працягу паўгодзьдзя не забясьпечым выкананьня пляну, дык у далейшым нашы цяжкасьці з яго выкананьнем значна ўзмоцняцца. Пагэтаму ўся праца, зьвязаная з хлебазагатоўкамі, вымагае развіцьця максымальна магчымых тэмпаў. У новую хлебазагатоўчую кампанію патрэбны самыя высокія тэмпы, якіх мы ніколі раней ня мелі. Гэтыя тэмпы патрэбны і ва ўсіх галінах працы, зьвязаных з хлебазагатоўкамі.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

аб назначэньні тав. Саламонава П. М. намесьнікам Народнага Камісара Працы БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

Назначыць т. Саламонава, Пятра Мацьвеявіча, намесьнікам Народнага Камісара Працы БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

17-га верасьня 1929 г.
г. Менск.

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб аслабаненьні т. Кудзелька М. С. ад абавязкаў адказнага рэдактара газэты „Савецкая Беларусь" і аб назначэньні т. Шастакова П. П. адказным рэдактарам газэты „Савецкая Беларусь".

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Аслабаніць т. Кудзелька, Міхася Сімонавага ад абавязкаў адказнага рэдактара газэты „Савецкая Беларусь"

2. Назначыць Шастакова Паўла Пятровіча, адказным рэдактарам газэты „Савецкая Беларусь".

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

17 верасьня 1929 г.
г. Менск.

Новыя крыніцы прыбытку.

УВАГА КРОЛІКУ.

Калі ня лічыць вельмі нязначныя па колькасьці аматарскія рассаднікі кролікаў, дык можна сказаць, што разьвядзеньне кролікаў, як галіна народнай гаспадаркі, у БССР адсутнічае. Можна толькі пашкадаваць, што гэта вельмі карысная для чалавека жывёліна не атрымала да гэтага часу адпаведнай ацэнкі з боку нашай гаспадаркі. Кролік дае здаровае, вельмі спажыўнае мяса, карыснае асабліва для дзяцей і хворых; прычым па рэнтабельнасьці вытворчасьці мяса кролік займае адно з першых месц. Адна самка ў працягу 3-х год можа даць патомства ў 2000—2500 галоў, гэта значыць—звыш 5000 кілё добрага мяса і звыш 2000 скурак па 3—5 р. кожная. За гэты-ж пэрыяд сярэдняй вагі карова можа даць патомства вагою толькі каля 1000 кілёматраў. Скурка кроліка па сваіх якасьцях можа з посьпехам замяніць скуркі і пушных зьвяроў і зьвяліца прадуктам для вывазу ў іншыя краіны. Кролік дае і шмат іншых карысных прадуктаў, як клей, пух і інш.

Усе гэтыя карысныя гаспадарчыя якасьці кроліка добра ацэнены за межамі, і разьвядзеньне кролікаў у гаспадарцы заходня-эўропэйскіх дзяржаў і Амэрыкі займае значнае месца. У аднэй толькі Францыі атрымліваецца 150 мільёнаў кілё мяса і 100 мільёнаў скурак на суму каля 500 мільёнаў руб. Не гледзячы на такое значнае разьвіцьцё ўласнага кролікаводства, Францыя ды іншыя дзяржавы імпартуюць шмат тысяч тон кролікавых тушак з Амэрыкі Аўстраліі. Пясьпяховае разьвіцьцё кролікаводства можа задаволіць ня толькі нашы ўласныя патрэбы ў мясе і пушніне, але дасьць магчымасьць пашырыць наш экспарт.

У пяцігадовым пляне разьвіцьця сельскай гаспадаркі БССР кролікаводзтва мае некаторы адбітак, асабліва племянное кролікаводзтва па лініі Белсельтрэсту і Ўправы Дзяржаўнага Гандлю. Да канца пяцігодзьдзя гэтыя ўстановы будуць мець каля 10-ці заводаў з матачным складам кролікаў у 3000 галоў, якія вынусьцяць да 40.000 штук племяннога маладняка.

У бягучым годзе пачалі працаваць 2 заводы: адзін па лініі Белсельтрэсту ў Сеньніцы і адзін Управы Дзяржгандлю ў Курасоўшчыне, Менскай акругі. На гэтых заводах атрыман з Нямеччыны вельмі каштоўны племянны матар'ял гатункаў „шыншыля" і „белы велікан". У бліжэйшыя месяцы заводы будуць выпускаць насельніцтву племянных самцоў (самкі пакуль што пойдуць на ўкамплектаваньне новых дзяржаўных заводаў).

Задачай сёньняшняга дня малочна-жывёлаводнай каапэрацыі і вясьмельных органаў павінна зьвяліца выяўленьне рассаднікаў кролікаў, якія ёсьць у БССР, уцягненьне іх у каапэрацыю і снабжэньне гатункавымі самцамі. Поруч з гэтым трэба паступова арганізоўваць у калгасах, савгасах і жывёлаводных т-вах больш буйныя рассаднікі кролікаў.

Разам з папулярызацыяй кролікаводзтва трэба даць насельніцтву і элементарныя веды па разьвядзеньню і догляду за кролікамі, лячэньню хвароб кролікаў і інш., дзеля чаго неабходна будзе арганізоўваць курсы для кіруючага пэрсаналу пры Беларускай с-г. Акадэміі і масавыя курсы на мясцох.

Практыка нашых заводаў паказала, што наша вэтэрынарыя слаба ведае хваробы кролікаў і іх лячэньне; гэты прабел таксама трэба зьнішчыць. Трэба наладзіць дасьледчую справу па кролікаводзтву. Дасьледчыя ўстановы, калі ня змогуць весьці дасьледы непасрэдна на станцыях, павінны рабіць гэта на вытворчасьці—у бліжэйшых заводах і рассадніках.

Свідэрскі.

Падрыхтоўка да ўсебеларускай с.-г. выстаўкі ідзе слаба.

Дзяржбуд зрывае пляны будаўніцтва.

Чаму адсутнічае аддзел калектывізацыі?

Гэтымі днямі ў Менску на агульным сходзе спэцыялістаў быў заслухан даклад прадстаўніка выставачнага камітэту НКЗ і ВСНГБ тав. Грушэўскага аб падрыхтоўцы да ўсебеларускай сельска-гаспадарчай выстаўкі.

— Тэрыторыя выстаўкі—адзначыў дакладчык,—займае 75 гэктараў зямлі і вызначана на Барысаўскім тракце таму, што гэта месца зьяўляецца як-бы асяродкам знаходжаньня навуковых станцый нашага Навуковага Дасьледчага Інстытуту. Зараз вырашаецца пытаньне аб перадачы гэтай тэрыторыі Інстытуту імя Леніна.

Што на сёньняшні дзень зроблена на выстаўцы?—ставіць дакладчык пытаньне і адказвае:

— Глеба амаль што падрыхтавана, севазвароты заложаны, азімыя амаль поўнасьцю засеяны. Скончана разьбіўка саду на плошчы ў 6 гэктараў. У бліжэйшыя дні будзе прыступлена да закладкі ягадных кустоў.

Надзвычайна капска праходзіць будаўніцтва павільёнаў. Па каляндарнаму пляну Дзяржбуду павільёны электрыфікацыі і мэханізацыі павінны былі пачаць будавацца яшчэ ў другой палове жніўня, але і па сёньняшні дзень да працы не прыступілі.

Дзяржбуд тлумачыць усё гэта... аб'ектыўнымі ўмовамі.

Па іншых павільёнах наглядаюцца тыя-ж промахі: пляны будаўніцтва ня выконваюцца Дзяржбудам.

Праэктыроўка будаўніцтва праходзіла габінэтным парадкам. Праэкты нідзе не абмяркоўваліся, акрамя праэктнага бюро, якое ўзгадняла іх толькі з загадчыкамі аддзелаў і п/аддзелаў.

На шырокіх рабочых сходах і на сходах спэцыялістаў праэкт будаўніцтва не разглядаўся.

У выніку: некаторыя павільёны, як, напрыклад, павільён жывёлагадоўлі пабудаваны кепска, бязсыстэмна, у часе пабудовы робяцца шмат якія дадаткі і зьмены.

Акругі да ўсебеларускай выстаўкі рыхтуюцца слаба, адсутнічае сыстэмачная праца па папулярызацыі выстаўкі і г. д.

Яшчэ да гэтага часу ня складзены пляны правядзеньня экскурсій і абслугоўваньня сялянства ў часе выстаўкі, ня гледзячы на тое, што выстаўка прадугледжвае прапусьціць 60—80 тысяч чалавек.

Даклад т. Грушэўскага выклікаў шырокія спрэчкі.

— Мы зараз праводзім,—кажа тав. Левікаў,—наступ на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі, мы ўзялі рашучы курс на калектывізацыю сельскай гаспадаркі, на перабудову яе на сацыялістычны лад. Ці адбіваецца гэта ў праэктах выстаўкі? Не!

У плянах нават не прадугледжана пабудова аддзелу калектывізацыі. Ён няпрыкметна раскінуты па іншых аддзелах.

— Сярод шырокіх колаў працоўнага насельніцтва,—зазначаюць многія прамоўцы,—слаба папулярызавана ўсебеларуская с.-г. выстаўка, рабочыя слаба інфармуюцца аб ходзе работ і значэньні сельска-гаспадарчай выстаўкі.

— З боку некаторых загадчыкаў аддзелаў наглядаюцца нядбайныя адносіны да выканаўня сваіх абавязкаў. Напрыклад, заг. аддзелу мэліярацыі нават ні разу не наведаў свайго аддзелу.

Сход прыняў рэзалюцыю, у якой вызначаюцца шляхі да палепшаньня падрыхтоўчай працы да выстаўкі.

Ма.

БІБЛІАГРАФІЯ.

КАПІТАН МАРЫЭТ: «Маленькі дзікун». Аповесьць. БДВ. 1929 г.

Пасьля „Рабінзона Крузо"—Даніэля Дэ-Фо разьвялася багатая пераймальная літаратура на тэму аб самотнасьці чалавека на забытай высьпе. Ідэйнасьць гэтай літаратуры зьяўляецца ў закліканьні да першабытнасьці, у довадах таго, што чалавек па-за грамадой больш чысты маральна, чым чалавек у грамадзе.

Да гэтай літаратуры належыць і „Маленькі дзікун".

Капітан Марыэт робіць гэроям дзіця, якое нарадзілася на забытай высьпе. Праўда, тут няма тэй псыхалёгічнай глыбіні, якая ёсьць у „Рабінзоне Крузо", і гэта толькі добры бок „Маленькага дзікуна". Апошняя больш зразумела дзіцяці, бо яму бліжэй перажываньні малога хлапчука, чымся дарослага чалавека. Дзіця пазнае шмат цікавых рэчаў, ня будучы прымушаным наглыбляцца ў філёзофічны сэнс гэтых рэчаў, які ёсьць у „Робінзоне Крузо".

Нездарма шмат разоў узьнімалі пытаньне аб тым, што гэта кніжка не для дзяцей.

Вось чаму „Маленькі дзікун" зьяўляецца ўдалым і карысным пераймальным „Робінзона".

Закліканьне да першабытнасьці ў Імя так выпукла, хоць і ёсьць намёкі на тое, што дзіця, якое вырастае на ўлоньні прыроды, у барацьбе з гэтай прыродай, пазбаўленае ўсякіх культурных сродкаў для барацьбы больш здароўе ня толькі фізычна, але і маральна.

Прыемна з ідэйляе адсутнасьць у аповесьці сусальнасьці, якая вельмі распаўсюджана ва ўсёй дзіцячай літаратуры.

Здарэньні ў гэтай кніжцы вельмі далёкія ад нашай сучаснасьці, але яна зьяўляецца вельмі цікавай тым, што назучае цаніць культуру. На фоне тэй першабытнасьці, сярод якой вырас „Маленькі дзікун", гледзячы на тое, як ён радаваўся ўсякаму кавалачку жалеза, вяроўкі, рыбы, дзеці пачынаюць цаніць высокую ступень нашае культуры. Больш таго, кніжка іх навучае глядзець утылітарна на нашыя культурныя дасягненьні.

„Маленькі дзікун" дае ня толькі повад да разважаньняў, але і да самастойнасьці.

Вось чаму, ня гледзячы на адсутнасьць сучаснасьці, гэта кніжка карысная.

Р. Г.

КІНО.

„Шчасьлівыя кольцы".

„ПРОЛЕТАРЫ".

Камэдыі шмат даруецца таксама як лірычнаму твору. Ну і што-ж, калі няма пэўнай устаноўкі, ці ідэалёгіі? Абы сьмешна, і ўсё як трэба.

Нельга сказаць, каб „Шчасьлівыя кольцы" зусім бяз добрых якасьцяў. Але ў ёй нічога грунтоўнага, нічога асаблівага ня вызначана. Гэтая камэдыя ня сьмешная. Яна злучана асобнымі, нічога супольнага ня маючымі кавалкамі. Тут ёсьць вельмі добрыя кадры (культурфільмавыя) аб хлебазаводзе. Досыць яскрава вызначаны працэс вырабу хлеба. Такія кадры можна толькі прывітаць, побач з імі ёсьць яшчэ кадры фізкультуры. І калі паказ хлебазаводу, фізкультуры апраўданы нашай сучаснасьцю, дык чым апраўдана ўся гісторыя з мешчанінам? Невядома якое ідэалёгічнае месца гэта гісторыя займае ў фільму, але па мэтражу яна займае самае вялікае.

Таксама невядома якую мэту праследуе рэжысэр гісторыяй аб мешчаніне, які трымаў балаган для кіданьня кольцаў; малады рабочы зайшоў туды і закахаўся ў яго дачку, якая мела жаніха. Малады рабочы хацеў яе адбіць у жаніха, але да яго гэтая сямейка (апроч дачкі) адносілася з вялікай пагардай;—з кім захацеў параўнацца: з жаніхом, які мае гроші.

І вось малады і горды рыцар (рабочы таксама) парашыў адпомсьціць. Ён так вывучыўся кідаць кольцы, што абыграў „папашу" зусім. Але гэта ўжо было чыстае мастацтва: так як тым часам, ён ужо пасьпеў расчаравацца ў мяшчанацы і закахацца ў сьмелую спартсмэнку. Гэта здараецца па прычынах вядомых толькі рэжысэру: гледачу-ж гэта зусім незразумела.

Калі можна было-б лічыць камэдыю агіткай за фізкультуру было-б вялікім палягчэньнем як для нас, так і для самой камэдыі. Але ў ёй так мала фізкультуры і так шмат мяшчанскага быту і перамятваванай гордасьці, што... няхай скажуць чытач і глядач:—ці трэба адносіць гэтую камэдыю да ідэалёгічнага каштоўнага твору, ці да бязідэйай блітаніны, дзе сам рэжысэр ня ведаў, што ён хацеў сказаць.

Р. Г.

ХРОНІКА.

23-га верасьня першы дзень прызыву грамадзян 1907 году нараджэньня.

У Акраўенкамаце нашаму супрацоўніку паведамілі аб ходзе падрыхтоўчай працы да прызыву грамадзян 1907 году. нараджэньня.

— На мясцох праведзены масавыя сходы беднаты, дзе ўсебакова абгаворваліся кандыдатуры асобных прызыўнікоў. Сходы выклікалі вялікую зацікаўленасьць з боку працоўнага сялянства.

Прафсаюзныя арганізацыі няўважліва адносяцца да прызыву. Кіруючыя органы разаслалі абежнікі і на гэтым супакоіліся... Слаба праходзіць падрыхтоўка ў навучальныя ўстановы, асабліва ў БДУ.

У першы дзень прызыву, які вызначан на 23 верасьня, будуць прызываца грамадзяне з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй.

Прызыў будзе працягнут да 1-га лістапада.

На ўсіх пунктах будуць устаноўлены буфэты МЦРК для абслугоўваньня прызыўнікоў. Буфэты ЦРК таксама будуць і у раёнах.

Для правядзеньня культасьветнай працы сярод прызыўнікоў на час прызыву будуць вылучаны агітпрацаўнікі; таксама будуць арганізаваны спэцыяльныя гурткі па розных бягучых пытаньнях.

У сувязі з прызывам у Акраўенкамат паступае многа заяў ад грамадзян 1908-9 г. г. нараджэньня, якія жадаюць уступіць добраахвотна ў Чырвоную армію.

Гутаркі сярод рабочых аб дню калектывізацыі.

Дзеля папулярызацыі сярод рабочых кампаніі па калектывізацыі вёскі саюз швэйнікаў пастанавіў правесьці на прадпрыёмствах сярод рабочых гутаркі ў часе абедзенных перапынкаў па пытаньню аб дню калектывізацыі. У вёскі выяжджаюць рабочыя брыгады.

Школа-перасоўка.

Саюз с.-г. і лясных рабочых накіраваў у Самахвалавіцкі раён школу-перасоўку, якая праводзіць сярод сялянства шырокую культасьветную працу.

Школа-перасоўка практыкуе прыём у саюз. Так, у савгасе „Прылукі" у саюз прыняты 10 батракоў.

Лекавыя ўстановы— на бесперапынны рабочы тыдзень.

Прэзыдыум ЦП саюзу мэдсанпрацы запрапанаваў усім мясцкомам і вытворчым камісіям абгаварыць на шырокіх сходах прафактыву і служачых пытаньне пераводу ўсіх лекавых устаноў Беларусі на бесперапынны рабочы тыдзень.

Выключаем з саюзу шкоднікаў сацыялістычнага будаўніцтва.

На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму ЦП саюзу камунальнікаў разглядалася справа аб выключэньні з саюзу братоў Чартовых М. і Б., якія выявілі сябе, як шкоднікі сацыялістычнага будаўніцтва. Да часу, пакуль сталі чысьціць каміны,—яны займаліся кантрабандай. У апошні час агітавалі сярод членаў саюзу за зрыў калдагавораў і сацыялістычнага спаборніцтва, супроць падпіскі на 3-ю пазыку.

Сярод рабочых вядомы, як хуліганы. Прэзыдыум зацьвердзіў пастанову аб выключэньні братоў Чартовых на 3 м-цы з саюзу.

* * *

Прэзыдыум ЦП саюзу будаўнікоў пастанавіў выключыць з саюзу б. падрадчыка—рабочага будаўніка гр. Сырыца. Сырыц у часе працы на пабудове Весялоўскай школы знарок шкодзіў працы пры кладцы фундаманту.

Выключан з саюзу сгодна пастановы Лепельскага райённага рабачкому.

Саюз мэдсанпрацы—да дню калектывізацыі

Прэзыдыум ЦП саюзу мэдсанпрацы, абгаварыўшы пытаньне аб правядзеньні дню калектывізацыі, пастанавіў прыняць актыўны ўдзел у яго правядзеньні. Для ўзмацненьня працы сярод сялянства ў часе правядзеньні дню калектывізацыі ў вёску будзе накіравана рабочая брыгада.

15 заводаў—на 7-гадзінны рабочы дзень.

Прэзыдыум ВСНГБел. пастанавіў у I квартале 1929-30 году перавесьці на 7-х гадзінны рабочы дзень Менскі дражджавы завод „Пролетары", Віцебскую махорачную фабрыку, Бабруйчую фабрыку „Коміндэрн" і Віцебскую панчошна-трыкатажную фабрыку.

Агулам у наступным гаспадарчым годзе на 7-х гадзінны рабочы дзень будзе пераведзена 15 прадпрыёмстваў рэспубліканскай прамысловасьці.

Кантрактацыя студэнтаў для прамысловасьці БССР.

У бягучым годзе ВСНГБ па розных вышэйшых тэхнічных навучальных установах Саюзу закантрактаваў 86 студэнтаў для рэспубліканскай прамысловасьці. У 1929-30 годзе пастановлена закантрактаваць 140 студэнтаў, з іх 14 месц адведзена БДУ і політэхнікумам БССР. Будуць закантрактаваны, галоўным чынам, спэцыялісты—мэханікі, хімікі, будаўнікі і іншыя.

На апошнім студэнтам у наступным годзе будзе затрачана 250.000 руб. Стыпэндыі будуць выплачвацца у такім разьмеры: студэнтам 3 курсу—па 70 руб., 4 курсу—па 85 руб., 5-га курсу—па 100 руб. І тым, якія здалі ўсе залікі і ўзялі дыпломную працу,—па 120 руб. у месяц.

2-гі дзень індустрыялізацыі—замест яўрэйскіх сьвят.

ЦП саюзу камунальнікаў вынесла на шырокае абгаварэньне рабочых-яўрэяў пытаньне аб правядзеньні другога дню індустрыялізацыі ў часе яўрэйскіх сьвят.

Сярод рабочых іншых нацыянальнасьцяў 2-гі дзень індустрыялізацыі будзе праведзен 25 сьнежня.

Кватэры рабочым.

Саюз гарбароў атрымаў 10 кватэр у нова пабудаваных дамох Менску.

Кватэры разьмяркованы сярод рабочых прадпрыёмстваў.

РАБСЕЛЬКОРЫ НАМ ПІШУЦЬ.

СВАЯ КАШУЛЯ БЛІЖЭЙ ДА ЦЕЛА.

Як толькі выбралі селяніна Рамана Латышова (Аршанская акруга) членам сельсавету, дык ён пры вучоце аб'ектаў абкладаньня захаваў пяць дзесяцін зямлі і свае неземляробскія прыбыткі. Латышоў лічыцца незаможным серадняком, а на справе ён зьяўляецца моцным серадняком, якога трэба разам з братам ападаткаваць індывідуальна.

Мімахожы.

КУЛАКІ СЬМЯЮЦЦА.

Калектыў „Першага Мая", Азарыцкага раёну, Мазырскай акругі арганізаваны ўжо другі год і ніяк ня можа прыступіць да сваёй гаспадарчай дзейнасьці, бо яшчэ не зацьверджаны праэкт землеўпарадкаваньня. Калі землеўпарадкаваньне ня будзе праведзена як найхутчэй, калгас абавязкова разваліцца. А кулакі ўжо сьмяюцца,—„Га-га-га. Во, вам галандранцы!—камуны ім захацелася!.. Ражна вам, а не землеўпарадкаваньне!.." Крыўдна гэта слухаць калгасьнікам—беднаце і малазаможным серадняком.

Ляўковіч А.

НА МОСЬЦЕ КОНІ ЛОМЯЦЬ НОГІ.

На мяжы раёнаў—Смалявіцкага і Астрашыцка-Гарадзецкага ёсьць паламаны мост праз рэчку Валму. Ужо шмат коняй ваколічных сялян паламалі ногі на гэтым мосьце, але, райвыканкомы, ні дарожнае кіраўніцтва ня думаюць паправіць мост.

П. Макарэвіч.

ЧАМУ ЯНО ТАК?

З 81 жніўня распачалося даручэньне акладных лістоў сялянству. Сёлета падатак значна зьніжаны для малазаможных. Толькі вось невядома, чаму ападаткавалі некаторых беднякоў, напрыклад: гр-на вёскі Шмані Чэрвенскага раёну Шаркоўскага сёлета ападаткавалі, хоць ён як бядняк, летась ад падатку быў звольнены Ападатканы таксама і іншыя беднякі. Гэта няправільна—РВК няхай перагледзіць гэту справу.

Я. Кр.

НА ЗЛОСЬЦЬ КУЛАКОМ—БУДУЕМ КАЛГАСЫ.

У дзень калектывізацыі на кусьлаўм сходзе шасьці пасёлкаў у арцелі „Векер", прысьвечаным дню калектывізацыі, выступілі кулакі—Вазовікаў С. і Бобікаў М., якія з пенаю ў роце агітавалі супроць калгасаў. Гэтыя кулакі зьяўляюцца самымі злоснымі ўтойшчыкамі аб'ектаў абкладаньня. Аднак, ня гледзячы на іх агітацыю, якой быў дадзены належны адпор, у гэты дзень у вёсцы Кленавіца, Смычкоўскага сельсавету, Уваравіцкага раёну. Гомельскай акругі арганізаваны калгас. Хутка будзе арганізаваны другі калгас у вёсцы Смычкі таго-ж раёну.

Селькор—Знаючы.

ВЫЧЫСЬЦІМІ З ПАРТЫІ ГУЛЬТАЁЎ.

У Тураўскім райёне, Мазырскай акругі, з 5 вясковых ячэек КП(б)Б вычышчана 10 асоб, галоўным чынам, за адмову ісьці ў калгасы. Адзін „мудрэц", былы партыец Ляўковец, на прапанову ісьці ў калгас адказаў: „Нахай жыды ідуць у калгасы". Вычашчаны некаторыя і за скрыўленьне клясавай лініі.

С-н.

НЯ СКІДАЕ ВОЎК АВЕЧАЙ СКУРЫ.

Ужо пісала аб гэтым „Беларуская Вёска", але нічога не памагло.

Бярэзінскае сельска-гаспадарчае таварыства ўзяло пад сваю апеку Ваньковіча Ф., ня гледзячы на тое, што артыкул, „Воўк у [авечай скуры" зьмешчаны ў газэце „Беларуская Вёска" адпавядаў сапраўднасьці. Ваньковіч увесь час трымае цесную сувязь з кулацкаю гаспадаркаю свайго бацькі.

Гэткім учынкам бярэзінскія бюракраты і падкулачнікі падкрэсьлілі, што яны зьяўляюцца абаронцамі кулацтва, што ім газэты, што ім савецкая ўлада?!..

Нябоpокі.

САМАКРЫТЫКА ДАПАМАГЛА.

Да 1928 году на Поляччыне ў Зьмітраўскім сельсавеце дрэнна вялася палітычна-грамадзкая праца. Але калі арганізаваўся ў нас селькораўскі гурток, і селькоры першыя распачалі крытыку і самакрытыку, справа палепшылася. Закіпела грамадзкае жыцьцё пад узмоцненым кіраўніцтвам ячэйкі КП(б)Б.

Піл. Баз.

ВЫЙДЗЕ... ЛАЗЬНЯ З 75° ЦЯПЛЫНІ.

Белхарчтрэст надумаў перабудаваць крахмальны завод „Аннопаль" на сагавы. Склалі плян, паводле якога цэхі—сушыльны і парыльны—будуць знаходзіцца ў адным памяшканьні. Рабочым пры 75° Ц. працаваць зусім немагчыма. Перабудова будзе каштаваць 90 тысяч руб. Рабочыя гавораць, што гэткая перабудова нерацыянальная: „Ня варта аўчыка вырабу". А пра думку рабочых, якія, здаецца, маюць права абгаварваць мэтазгоднасьць перабудовы заводу, ніхто ня спытаў. Ці-ж гэта не галавацяпства?

Рабкор Баян.

«НАШТО СЯЛЯНАМ КОЖНЫ ДЗЕНЬ ГАЗЭТЫ».

Даманавіцкая пошта, Калінкавіцкага раёну, толькі адзін раз у тыдзень дастаўляе падпісчыкам газэту. Працаўнік пошты, тав. Філіпенка, гаворыць: „На што сялянам кожны дзень чытаць газэту".

Дзед Нічыпар.

СЛУЦАК ТОПІЦЦА Ў ГРАЗІ.

У Слуцку такая грязь (асабліва да станцыі чыгункі), што прайсьці вельмі трудна, а ніхто ня думае паправіць вуліцы і дарогі. У райёне за вёскай Ячава ёсьць балотныя равы, праз якія сяляне пачалі будаваць мост на сродкі ад самаабкладаньня. Грошай не хапіла і мост стаіць недакончаны. Цікава, ці ёсьць у Слуцку Аўтадор і што ён там робіць?

Д. Я.

Б. ЦАРСКІ СЛУЖАКА—У КААПЭРАЦЫІ.

У Баёўскім спажывецкім каапэратыве служыць прыказчыкам гр-н Радкевіч Міхась, які раней быў заядлым старарэжымным чыноўнікам. Ён у 1922 годзе быў адным з арганізатараў развалу каапэратыву. Гэты прыказчык зноў арганізуе развал каапэратыву. Трэба ад яго пазбавіцца.

Я. Крук.

ПАДРЫХТОЎКА ІДЗЕ ДРЭННА.

У Сьмілаўскім раёне падрыхтоўка да асеньняй сяўбы праходзіць дрэнна. Рудзенскі КСУ яшчэ ня склаў пляну асеньняй пасеўнай кампаніі. Камітэт грамадзкай заворкі сем'ям чырвонаармейцаў і і ўдовам не працуе. Ва ўсіх сельсаветах раёну слаба праходзіць растлумачальная праца. Белсельсаюз ня выканаў заявак на с.-г. машыны і гатункове насеньне. Няма таксама і мінэральнага ўгнаеньня.

М.

НЯМА ГАСПАДАРА.

У вёсцы Косавічы, Зеляноцкага сельсавету, Мазырскай акругі, ёсьць сад, які пры добрым даглядзе мог-бы даць у год 600 рублёў прыбытку. Сад арандуе гр-н Пілілейка, які давёў яго да таго, што ў ім засталося толькі 45 процантаў дрэў. Сельсавет і РВК маўчаць і з „лёгкім сэрцам" глядзяць, як гіне дзяржаўная маемасьць.

Бальковуў.

КУЛАКІ ГАНДЛЮЮЦЬ ЗЯМЛЁЮ, А СЕЛЬСАВЕТ І «ЎВУС НЯ ДЗЬМЕ».

У Старадарожскім раёне, Бабруйскай акругі, ідзе гандаль зямлёю, а ўлада маўчыць. Напрыклад, гр-н вёскі Гасьцінцы Шэшка Антось купіў кусок зямлі ў кулака Шэшкі Паўлюка і заплаціў яму 10 рублёў. На хутары Каранец былы абшарнік Гурыновіч Адам прадаў сваю зямлю з будоўляю сялянам в. Зялёнкі за вялікія грошы. Фактаў гэткіх ёсьць многа.

Вяскор.

ЯК ПРАЙШОЎ ДЗЕНЬ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

У Пухавіцкім раёне ў дзень калектывізацыі ў Паўловіцкім сельсавеце арганізаваны новы калгас. У вёсцы Зяленькава арганізавана ў гэты дзень машыннае таварыства. Па ўсіх вёсках сельсавету прайшла пасьпяхова падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.

Селькор Графанкоў.

КУДЫ ІДУЦЬ ГРОШЫ АД САМААБКЛАДАНЬНЯ.

У вёсцы Балотні на Магілёўшчыне сяляне правялі самаабкладаньне і сабралі 1384 рублі 56 кап., з якіх 555 рублёў пойдзе на пабудову калодзежаў у новых пасёлках, 69 рублёў на школьнае будаўніцтва, 69 рублёў на пажарную ахову, а рэшта—на дарожную справу.

І.

«КУЛЬТУРНАЯ» ЧАЙНАЯ.

У Полацку Чырвоны Крыж адчыніў культурную чайную, якая мае на мэце змагацца з алкагалізмам. Аднак, назва „культурная" зусім не адпавядае фактычнаму становішчу чайной, бо яна пастаўлена вельмі дрэнна. Чайную нашу назвалі „культурнай", ма'быць, таму, што на сталох ляжаць... леташнія газэты, альбо, у лепшым выпадку, з 4-6 месячным „стажам"—і ўсё...

А калі наведвальнік купіць сабе квіток на чай, дык гэтага чаю трэба чакаць дзьве-тры гадзіны. У чайную ніхто ня ходзіць, хіба толькі які-небудзь аматар бясплатнае паперы на цыгаркі. Вось дык „культурная!"

Крушына.

СУД.

Кулацкае гніздо.

Кулакі з хутару Загур'е Станькаўскага сельсавету, Койданаўскага раёну; Мікола Ляськевіч і Леанарда Гарбёнак задумалі пераехаць на сталае жыцьцё ў г. Менск.

Паедзем, даражэнькая, паедзем,— казаў Ляськевіч сваей суседцы Гарбёнак—Будаем жыць у сталіцы, вучыць дзетак, пабудуём дамы. Горш як на гаспадарцы ня будзе.

— Ну, а як будзе з зямлёй?—запыталася Леанарда у свайго добрага суседа Ляськевіча.

— З зямлёй? Прадамо!

— А ўласнасьці-ж на зямлю на існуе? Хто купіць яе? Як зрабіць умовы?

— Нічога, зробім усё.

Пакупцы на зямлю знайшліся вядомыя кулакі Мікалай Лойка і Кастусь Хаменка.

Будучы ў добрых адносінах са старшынёю Станькаўскага сельсавету, членам партыі Шабаком, сэкратаром Валасэвічам і старшынёю камітэту сялянскай узаемадапамогі Казнадзеем, Лойка і Хаменка наладзілі абед, паклікалі Шабана, Валасэвіча і Казнадзея і пасьля добрай гульні купілі зямлю. Лойка ў Леанарды Гарбёнак за 1000 р., а Хаменка ў Ляськевіча за 1100 р.

На куплю-продаж зямлі вясковае „начальства" пад уплывам сытнага абеду і гарэлкі згадзілася: былі складзены і пасьведчаны Шабаном, Валасэвічам і Казнадзеем пісьмовыя ўмовы.

Разыходзячыся па хатах, кулакі вельмі радаваліся, што дажылі да ўласнасьці на зямлю, хвалілі добрае вясковае начальства, якое пасьведчыла ўмовы за чарку гарэлкі і за смачны абед. Умова была складзена наупрэкі існуючага закону аб забароне куплі-продажы зямлі.

Апроч звальненьня Шабана, Валасэвіча і Казнадзея з пасад, яны разам з кулакамі прыцягнуты да адказнасьці і апынуліся на лаўцы падсудных.

Менскі акруговы суд, разглядзеўшы гэту справу: прыгаварыў: Леанарду Гарбёнак да штрафу ў прыбытак дзяржавы на 200 р., Мікалая Лойку і Кастуся Хаменку—па 100 руб. кожнага; старшыня с.-с. Шабан засуджан на адзін год зьняволеньня са скарачэньням пакараньня па амністыі напалову; Валасэвіч і Казнадзей —на шэсьць месяцаў прымусовых работ кожны, але на падставе амністыі ад пакараньня вызвалены. Справа адносна Ляськевіча, з прычыны сьмерці яго, спынена.

Д. К.

РАСТРАТЧЫК-СЫМУЛЯНТ.

У вёсцы Метча (Барысаўск. р.), ёсьць крама спажывецкага таварыства, якая зьмяшчаецца ў прыватным доме. Супольна з крамай ў адным памяшканьні—кватэра загадчыка крамай Уладзімера Жызьнеўскага, які заняў гэту пасаду з пачатку 1928 году.

Жызьнеўскі—чалавек з вялікім размахам. Ня гледзячы на тое, што пэнсія яго невялікая (30 руб. у месяц), якой толькі хапае на пражыцьцё з сям'ей, Жызьнеўскі штодня наладжваў п'янкі; хаўрусьнікамі яго ў гэтым былі мясцовыя жыхары—Ліхачэўскі і Паўловец.

Выпіўку і закуску Жызьнеўскі браў з каапэратыву бяз усялякага разьліку. На асабістыя выдаткі, як, напрыклад, на набыцьцё жонцы паліта за 200 р., Жызьнеўскі таксама запусьціў руку ў каапэрацыйную касу. У выніку—растрата ў суме 1443 р. 75 к.

Набліжаўся канец году, чакаць падліку і рэвізіі было „небясьпечна", і Жызьнеўскі, параіўшыся з жонкай, рашыў захаваць растрату шляхам сымуляцыі.

19-га сьнежня 1928 году, чуць золак, Жызьнеўскі зьявіўся ў барысаўскую раймілІцыю з паведамленьнем, што ноччу на краму зрабілі напад бандыты ў ліку 5 асоб і абрабавалі краму, забраўшы мануфактуру і іншы тавар на суму 1500 р. На месца здарэньня тэрмінова выехалі агэнт крымінальнага вышуку і сьледчы. Пры аглядзе крамы на дзьвярох знойдзена тры дзіркі пракручаньня Жызьнеўскім і іншых сьлядоў злачынства ня знойдзена. Праз допыт сьведак устаноўлена, што ніякага нападу на краму ня было, што Жызьнеўскі, каб ухіліцца ад адказнасьці за растрату, проста сымулюе.

Народны суд Барысаўскага раёну, разглядзіўшы гэту справу, прыгаварыў Уладзімера Жызьнеўскага на пяць год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем і пазбаўленьнем у правох на тры гады па адбыцьці кары.

Менскі Акруговы суд гэты прысуд зацьвердзіў, а скаргу Жызьнеўскага пакінуў бяз выпікаў.

Д. К.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 20-е ВЕРАСЬНЯ 1929 г.

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	4.92	—
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	126.90	128.90
Выйгр. пазыка 1929 г.	100.05	100.45
10 проц. выйгр. паз. 27 г.	25.33	25.43
3-я сялячск. выйгр. паз. 27 г.	5.04	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.38	10.73
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25.80	25.90
2 „ „ „ проц.	25.51,5	25.61,5
2 „ „ „ 6-проц.	25.86	25.96
11 проц. дзярж. паз. 28 г.	100.56	100.61
12 проц. рэнтная пазыка 1927 г.	103.60	—

ШАХМАТЫ № 31 (176)

Пад рэдакцыяй А. А. КАСПЭРСКАГА.

Задача № 29 Я. Каменецкага.



Бел. Кр b7, Сb4, Сg2, Кb1